Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:14 PM Page 3

*Жыве Беларусь!*

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 558 Ліпень 2009 г.
Год выданьня 58

# КАНГРЭС БАЗА: *дасягненьні і недахопы*

У суботу 30 травеня 2009 году ў грамадзкай залі царквы сьв. Маці Божай Жыровіцкай ў Гайлэнд-Парку (Нью-Джэрзі) адбыўся Кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). На гэтым форуме прадстаўнікоў усіх аддзелаў і групаў, якія ўваходзяць у БАЗА, прыехалі 24 дэлегаты, якія мелі дадаткова 21 ўпаўнаважаньне ад асобаў, якія ня бралі ўдзел асабіста.

Галоўнымі пытаньнямі Кангрэсу павінны былі стаць справаздачы і выбары, аднак дыскусіі разгарнуліся вакол іншых пытаньняў, якія былі ўведзеныя ў парадак дня ў апошні момант у разьдзел "Новыя справы пасьля папярэдняга Кангрэсу".

Ад самага пачатку праца праходзіла не ў адпаведнасьці з працэдурай. Галасаваньне па шэрагу істотных пытаньняў праводзілася да рэгістрацыі дэлегатаў і спраўджаньня іх паўнамоцтваў. Былі абраныя Прэзыдыюм у складзе сп. сп. Янкі Запрудніка (старшыня), Тацьцяны Красоўскай, Тацьцяны Кулакевіч, Сяргея Капыткі; і Мандатная камісія ў складзе: Валерыя Дворніка (старшыня), Міколы Цімашэнкі і Алы Кузьміцкай.

Пасьля прывітаньняў ад Старшыні Рады БНР (Івонка Сурвілла), Згуртаваньня Беларусаў Канады (Зьміцер Эльляшэвіч) і Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва (Вітаўт Кіпель) быў зачытаны і зацьверджаны пратакол папярэдняга Кангрэсу.

Наступнымі былі пытанньні, якія і выклікалі найбольш дыскусіяў і напружанасьці. Першым зь іх была выплата "заледласьці" ў пераліку сродкаў аддзеламі ў Галоўную Управу (ГУ). На мінулым Кангрэсе памер выплатаў кожнага аддзелу быў вызначаны ў суме $5 ад кожнага дзейнага сябра. Аднак дзеля таго, што ў шэрагу аддзелаў колькасьць сяброў і аплата складак не ўрэгуляваныя, у дыскусіі была выказана засьцярога, што пералік сродкаў фактычна ўскладаецца толькі на адзін аддзел у Нью-Ёрку, дзе справы сяброўства і складак дагледжаныя. Было вырашана стварыць камісію ў складзе старшыняў аддзелаў і ГУ для ўдакладненьня працэдуры ўліку сяброўства ў аддзелах і пераліку сродкаў зь іх у ГУ.

Найбольш гарачыя дыскусіі йшлі вакол пытаньня аб увядзеньні абмежаваньня

***Заканчэньне на бачыне 3***

Буйнейшая ў ЗША беларуская арганізацыя – Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне – раз у два гады праводзіць свае спаравааздачна-выбарчыя Кангрэсы. Сёлета ён адбыўся 30 травеня ў грамадзкай залі царквы Маці Божай Жыровіцкай ў Гайлэнд-Парку.

БАЗА ў бягучым годзе адзначае сваё 60-годзьдзе, і Кангрэс паказаў, што гэтая найстарэйшае ў ЗША беларускае аб'еднаньне захоўвае сваю дзеяздольнасьць і па-ранейшаму карыстаецца аўтарытэтам сярод беларускай эміграцыі. У залі прысутнічалі дэлегаты зь Нью-Ёрку, Нью-Джэрзі, акругі Вашынгтон, Канэктыкуту, прыслалі свае ўпаўнаважаньні дэлегаты з Кліўлэнду і Каліфорніі. Кідалася ў вочы, што на Кангрэсе пераважала моладзь. Адбываецца зьмена пакаленьняў, у шэрагі БАЗА ўліваюцца новыя эмігранты.

Прывітаньне ўдзельнікам Кангрэсу даслалі старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла і Зьміцер Эльляшэвіч ад Згуртаваньня Беларусаў Канады. З прывітальным словам ад імя Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва выступіў сп. Вітаўт Кіпель, які нагадаў пра шматгадовае супрацоўніцтва БІНіМу і БАЗА ды пажадаў Кангрэсу плённай працы.

Галоўная Управа паклапацілася, каб, апрача справаздачаў і выбараў, у парадак дня былі ўключаны актуальныя для жыцьця арганізацыі пытаньні. Таму сход адбываўся ў надзвычай актыўнай атмасфэры, насычанай спрэчкамі, спробамі знайсьці агульныя падыходы да вырашэньня праблемаў далейшай працы.

Старшынстваваў на Кангрэсе сп. Янка Запруднік, які ў пары са сваёй маладшаю намесьніцаю Тацьцянаю Кулакевіч, з вялікім майстэрствам арганізоўваў аўдыторыю і трымаў цьвёрды арганізацыйны парадак.

Напачатку былі заслуханыя справаздачы кіраўнікоў структурных адзінак БАЗА: Віталя Зайкі (Нью-Ёркскі аддзел), Яраслава Крывога (гурток у Вашынгтоне), Аляксандра Бяляўскага (гурток у Канэктыкуце), Алеся Арцюховіча (гурток у Каліфорніі), які даслаў пісьмовы тэкст. Мікола Цімашэнка распавёў пра тое, якая праца робіцца маладзёвай ар-

***Заканчэньне на бачыне 2***

# Купальле сьвяткуем па сонцу

Як добра, што субота і нядзеля прыйшліся як раз на 20 і 21 чэрвеня, бо гэта і была тая самая кароткая купальская ночка, калі сонца пачало свой адлік на зіму, скарачаючы па хвіліне кожны дзень і падаўжаючы кожную ночку! Як добра, што днём і ночку, то заціхаючы, то ўзмацняючыся ліў дождж! Як добра, што мы, не спалохаліся нягоды і сабраліся на Купальле ў запаведніку Ward Pound Ridge штату Нью-Ёрк! Як добра, што ёсьць у нас такія сябры, як Алена і Пятро Рыжыя, для якіх купальскае сьвята стала важнай вехаю іхнага жыцьця, бо менавіта на першым нашым нью-ёрскім Купальлі зарадзілася іхнае каханьне! Як добра, што потым у іх утварылася моцная беларуская сям'я! Як добра, што нарадзіліся на сьвет божы ў іх сям'і два цудоўных сінявокіх і белагаловых сыночка Янка і Алесік! Як добра, што такім каханьнем, дабром і сьвятлом асьветлены шлях гэтай сям'і, што калі сустрэнешся зь імі, то ня хочацца разьвітвацца! Дзякуй Пятру і Алене, што яны дабраахвотна ўзвалілі на сябе гэты цяжар па арганізацыі Купальля! Нізкі паклон ім за гэта ад усіх сяброў БАЗА і ЗБМА.

Апоўдні Пятро прывез мяне на пагорак, дзе пэўна ужо дзясяты год запар мы спраўляем наш самы вялікі традыцыйны абрад. Пятро замацоўваў навес, каб было дзе схавацца сябрам ў выпадку залевы, усталяваў пасярод пляцоўкі купальскае дрэва. Я ўпрыгожвала кола вянком і белчырвонымі стужкамі, якія сымбалізуюць стыхіі вады і агню, жаночага і мужчынскага пачаткаў, спалучэньне якіх дае працяг жыцьцю. Потым узялася майстраваць лялькю Мару, якая сымбалізуе, паводле паданьняў, ведзьму, якая апякуецца злымі сіламі. Нашая задача палягала ў зьнішчэньні яе ў вагні.

Тым часам пачала сыходзіцца моладзь. Пятро Рыжы сабраў хлапцоў на збор старых дрэваў для вогнішча. Дзяўчаты з задавальненьнем скідалі джынсы і апраналіся ў строі, прымяралі вяночкі. Пачалася вячэра.

Чатырохгадовы Янка, двухгадовы Алесік ў вышыванках сьмела мясілі босымі нагамі мокрую зямлю на пагорку і, разам з шасьцігадовай Паўлінкай Падлескай у стройчыку, былі галоўным упрыгожваньнем нашага сьвята.

Сьцямнела. Купалішам абралі самага статнага хлопца Марчэла, а Купалінкаю – ягоную дзяўчыну Тацьцянку. Перадаў Купаліш падпаленую паходню Купалінцы, тая падпаліла вогнішча. Але разгаралася яно слаба, бо ліў дождж. Сытуацыю ўратаваў Рыжы Пётра, якому давялося прыкласьці намаганьні, каб агонь разгарэўся.

Дождж толькі падбадзёрываў купальшчыкаў. Усе пабраліся за рукі, я пачала, а ўсе падхапілі рэфрэнам: "А ў нас сёньня – Купалачка, а ў нас заўтра – Іванічка, а хто ня быў на Купальлі, бадай таго закапалі..." Закружыўся карагод у напрымку сонечнага руху, каб сьпевамі, агнём й каханьнем перамагчы нячыстыя сілы, уславіць сонца, яго сьвятло і цяпло, росквіт прыроды і самаё жыцьцё, працяг роду беларускага.

Было нас каля трыццаці пяці чалавек. Не было глядачоў. Песьні зьмяняліся карагодамі. Спалілі Марэну пад улюбёны песенны танец: "Ня дзеўка агонь клала, сам бог агонь раскладаў..." Пад час гульні, скралі Купалінку, ды Князь Марчэл хутка знайшоў яе і на руках прынёс да вогнішча. Гульні пачаліся з новым імпэтам. Дождж суцішыўся. Паветра п'яніла, абвастраючы пачуцьці.

Наш даўні сябра баўгарын Станіслаў Станкоў, які ўжо чацьвёрты год купаліць з намі і заўзята сьпявае па-беларуску, пачаў скокі праз даволі высокае і шырока раскладзенае вогнішча. Купацца не пайшоў ніхто, бо нас вельмі добра вымылі воды нябесныя.

Паціху займалася зара. Сустрэлі яе песьняй: "А на Йвана сонца йграла", ужываючы традыцыйны крупнік, зварыны Пятром з траваў, мёду і гарэлкі. Асобна быў прыгатаваны і крупнік без алькаголю, толькі на травах і мёдзе. Зачаравана глядзелі на языкі полымя, пасеўшы вакол яго на лаўкі, зробленыя Рыжым.

Стомленыя, паціху сьпявалі песьні пра каханьне. Разгараўся цёплы новы дзень.

**Валянціна ЯКІМОВІЧ**



Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:14 PM Page 4



# Канцэрт у Атаве

У рамках канфэрэнцыі славістаў (Congress of the Canadian Federation of Humanities and Social Sciences) 24 травеня 2009 году ў Атаве адбыўся канцэрт беларускай музыкі, арганізаваны беларусамі Атавы і Таронта. Вялікі ўнёсак у арганізацыю канцэрту зрабіла прафэсар Зіна Гімпелевіч, прэзыдэнт Канадыйскай Асацыяцыі Славістаў.

У канцэрце, які адбыўся ў вялікай залі Атаўскага ўнівэрсытэту, узялі ўдзел атаўскі клясычны дуэт "Кантабіле" і знакаміты гурт "Яваровы людзі" з Таронта. У гэты дзень з Таронта прыехала больш за 30 асобаў. Канцэрт распачаўся выступам дуэту "Кантабіле", які прыгожа выканаў некалькі клясычных музычных твораў, а таксама апрацоўкі добра вядомых беларускіх песень "Жураўлі" і "Белавеская пушча".

"Яваровы людзі" прапанавалі гледачам новую праграму – прафэсійна і па-майстэрску зробленае відовішча. Праграма складалася з чатырох частак: Гуканьне вясны, Купальле, Жніво, Каляды. Кожная частка складалася з адмысловых сьпеваў, танцаў, народных строяў, з адначасовым выкарыстаньнем шумавых і сьветавых эфэктаў, слайд-шоў, дэманстрацыяй перакладаў тэкстаў песень на ангельскую мову. Канцэрт зрабіў вялікае эмацыйнае ўражаньне на гледачоў – неаднаразова гучалі воклічы "Брава!" і "Жыве Беларусь!". Адчувалася вялікая падрыхтоўка і прафэсійны падыход да справы ўсіх удзельнікаў спэктаклю.

Падзяку за канцэрт заслугоўваюць кіраўніца "Яваровых людзей" Віялета Кавалёва за яе мастацкі і арганізацыйны талент, атаўцы за прыём гасьцей з Таронта, а таксама ўсе, хто прыйшоў падтрымаць беларускіх артыстаў у той вясновы дзень.

Беларусь сапраўды жыве ў Канадзе – жыве багатая, напоўненая творчым натхненьнем людзей, іх шчырымі душамі і талентамі. Канцэрт яскрава паказаў, што беларуская дыяспара ёсць моцны і яскравы агмень, які аб'ядноўвае беларусаў у жаданьні не губляць, а пашыраць і дэманстраваць глыбіню вытокаў нашай нацыянальнай, духоўнай і культурнай ідэнтычнасьці.

*Паводле belaruscanada.com*



Выступае гурт "Яваровы людзі"

# Выстава Беларускага музэю

У Беларускім музэі, які месьціцца ў будынку сабору сьв. К. Тураўскага ў Брукліне 7 чэрвеня сёлета адкрылася выстава "Мары і думкі" мастачкі Алены Тылькінай. На выставе дэманструюцца працы, створаныя мастачкай цягам апошніх 30 гадоў.

Алена нарадзілася ў г. Ворша ў 1965 г., а сваю першую выставу наладзіла ўжо ў 13 гадоў. Мастацкую адукацыю атрымала ў Расеі і Беларусі. За гады навучаньня працавала ў розных галінах ад алею, акрылу, акварэлі, пастэлі і графікі да фрэскі, скульптуры і партрэтаў. Не абмяжоўваецца Алена адным стылем жывапісу і цяпер: яе працы – гэта і сымбалізм, і сюррэалізм, і рэалізм, і графіці, і эротыка.

У 1989 годзе мастачка эмігравала ў ЗША, дзе і жыве цяпер у Нью-Ёрку. А. Тылькіна атрымала мэдалі і адзнакі за ўклад у сусьветную мастацкую скарбонку, яе творы знаходзяцца ў шматлікіх прыватных калекцыях розных краінаў сьвету.

*Паводле belmuseum.org*

# Музэй-бібліятэка "Ахвяры Камунізму" запачаткаваная

У Вашынгтоне 16 чэрвеня адбылося некалькі падзеяў ў праграме "Ахвяры камунізму", у якіх бралі ўдзел і прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў.

А гадзіне 10.30-11.30 праходзіла цырымонія ўскладаньня вянкоў, кветак, памятных стужак ля помніка "Ахвяры камунізму", які быў адчынены два гады таму прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам-малодшым. Дарэчы, прыпомнім турыстам-наведвальнікам Вашынгтону, што помнік стаіць непадалёк галоўнага вакзалу Union Station у скверы пры скрыжаваньні Масачусэтс і Нью-Джэрзі авэню; ля помніка ёсьць лавачкі, каб прысесьці.

Ад гадзіны 12:30 да 3:30 папаўдні ў вялікай залі ўсходняга капітолю праходзіла акадэмія ўручэньня мэдалёў "Свабоды імя прэзыдэнтаў Трумана-Рэйгана" заслужаным дзеячам антыкамуністычнага руху: япіскапу Ласло Токэс з Румыніі, пасьмяротна кангрэсмэну Джэку Кэмпу зь Нью-Ёрку (у памяць кангрэсмэна трэба зазначыць, што ён неаднаразова спансараваў беларускія дэлегацыі ў Кангрэсе для адзначэньня ўгодкаў 25 Сакавіка) ды кангрэсмэну Стэні Гоэру – лідэру бальшыні ў Кангрэсе.

Былі зачытаныя таксама некалькі справаздачаў аб сёньняшнім стане віртуальнага музэю й бібліятэкі. У бібліятэку ўжо таксама ўлучаныя беларускія матэрыялы ды аналіз камуністычнае сыстэмы ў Беларусі.

Ад гадзіны 6-й да 9-й вечара праходзіла канфэрэнцыя ды заключны банкет ў рэзыдэнцыі румынскае амбасады ў Вашынгтоне, дзе асноўным прамоўцам быў сп. Джон Фунд з "The Wall Street Journal", які прааналізаваў камуністычную сыстэму і будучую шырокую дзейнасьць праграмы "Ахвяры камунізму".

Чытачом "Беларуса" прыпомнім, што дырэктарам фундацыі "Ахвяры камунізму" зьяўляецца шыроказнаны амэрыканскі дзеяч і навуковец др. Лі Эдуардс, іншымі дзеячамі ў праграме ёсьць каля дзесятка кангрэсмэнаў, некалькі сэнатараў і прафэсараў розных унівэрсытэтаў ды прадстаўнікі нацыянальных арганізацыяў.

У сёлетніх падзеях ад беларусаў удзельнічалі сп-ні Ірэна Красоўская і Алеся Кіпель, а ў падрыхтоўцы бібліятэкі бяруць удзел др. Вітаўт Кіпель і Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне.

*В. З.*

# Запісы БІНіМ №32

Рыхтуецца да друку і ў хуткім часе пабачыць сьвет чарговы нумар часапіса "Запісы БІНіМ".

Цэнтральная тэма нумару — падарожжы беларусаў, травэлёгі — прадстаўленая тут як аналітычна-агляднымі артыкуламі Лявона Юрэвіча "Моваю травэлёгу" і Навума Гальляшэвіча "Травэлёг Уладзімера Дудзіцкага", гэтак і разнастайнымі паводле жанраў апісаньнямі беларускіх вандровак у прасторы і часе. Тут ёсьць і дзёньнікі кшталту "Падарожжа на Аляску" Зоры Кіпель, і нізка падарожных лістоў, і аднойленае Аляксандрам Адзінцом эпісталярнае "Падарожжа самотнае душы: Вольга Таполя", і літаратурныя творы: "Несэнтымэнтальнае падарожжа" Д. Забранскага (Антона Адамовіча), "Госьці з Тунісу" Аўгена Кавалеўскага ды "Відавочца" Паўла Касьцюкевіча ды шэраг іншых цікавых матэрыялаў-травэлёгаў.

Акрамя тэкстаў, аб'яднаных агульнай "падарожнай" тэматыкай, у новым нумары "Запісаў БІНіМ", пабачаць сьвет цікавыя аўтабіяграфічныя "Ўспаміны пасла" Аляксандра Стагановіча з грунтоўнай прадмовай Алеся Пашкевіча, публікацыя Макса Шчура, прысьвечаная эміграцыйнаму пісьменьніку Вячаславу Разумовічу-Хмары, дасьледаваньне, прысьвечанае беларускаму паваеннаму камбатанцкаму руху Юрыя Грыбоўскага.

У працяг архівазнаўчай тэматыкі мінулага нумару ў новых "Запісах БІНіМ" пабачаць сьвет матэрыялы, што прыадчыняюць таямніцы архіваў Міколы Абрамчыка ды Дзьмітрыя Касмовіча, а таксама прадстаўляюць унікальныя матэрыялы БІНіМаўскай Купаліяны. Акрамя таго, у нумары пачынаецца новы праект "Віртуальны музэй БІНіМ", дзе прадстаўленыя рэдкія здымкі асобаў, падзеяў і рэчаў, зьвязаных зь беларускім жыцьцём на эміграцыі. Традыцыйна зьмяшчаюцца ў нумары рэцэнзіі і агляд найноўшых кніжных выданьняў эміграцыязнаўчай тэматыкі.

Спадзяемся, што новы нумар "Запісаў БІНіМ" знойдзе сваіх чытачоў. Па пытаньнях замоваў новага нумару зьвяртайцеся на адрас: .

*Рэдакцыя*

## Кангрэс БАЗА

*Заканчэньне з бачыны 1*

ганізацыяй БАЗА. Галоўны рэдактар газэты "Беларус" Марат Клакоцкі паведаміў аб тым, як ідуць справы з выданьнем газэты. Ад выдаўцоў часапіса "Belarusian Review" справаздачу зрабіў Вячка Станкевіч.

Са справаздачным дакладам аб дзейнасьці Галоўнай Управы выступіў старшыня Вячка Станкевіч. Гэта была ягоная першая справаздача на пасадзе кіраўніка арганізацыі. Два гады таму ён пераняў гэтую функцыю ад сп. Антона Шукелойца. Як вынікала з выступленьня сп. Станкевіча, ён узяўся за справу з поўнай адказнасьцю і зрабіў усё магчымае, каб БАЗА ня страціла свае пазыцыі і разьвівалася далей. Пашырылася структура арганізацыі, створаныя новыя адзінкі ў Вашынгтоне, Канэктыкуце, Каліфорніі. Прадстаўнікі БАЗА актыўна лабіявалі беларускія інтарэсы ў палітычных колах ЗША, правялі шэраг сустрэчаў з кангрэсмэнамі, сэнатарамі і іншымі высокімі асобамі. Аказвалася падтрымка дэмакратычнаму руху ў Беларусі, ладзіліся кантакты зь беларусамі ў іншых краінах, была праведзеная чарговая Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі ў Кліўлэндзе.

Галоўная Ўправа вынесла на абмеркаваньне пытаньне неабходнасьці зьменаў у Статуце БАЗА, які быў прыняты ў 1963 годзе. Шмат якія пазыцыі Статуту маральна састарэлі, некаторыя патрабуюць дакладнейшай фармулёўкі.

Дзеля збору прапановаў і падрыхтоўкі тэкстаў зьменаў у Статуце была створаная адмысловая камісія ў складзе 5 чалавек: Яраслаў Крывы – старшыня, Алеся Кіпель, Віталь Зайка, Мікола Цімашэнка, Ільля Куніцкі, Ганна Сурмач. Камісія павінна будзе падрыхтаваць тэксты зьменаў да наступнага Кангрэсу. Усе сябры БАЗА, якія маюць прапановы адносна ўдасканаленьня Статуту, могуць падаваць іх у гэтую камісію.

Найбольшыя спрэчкі на Кангрэсе выклікала прапанова Галоўнай Управы прыняць абмежаваць колькасьць кадэнцыяў старшыні Галоўнай Управы і кіраўнікоў аддзелаў. Вячка Станкевіч патлумачыў гэта неабходнасьцю зьмены кіруючых кадраў, каб як мага больш новых людзей далучалася да арганізацыйнай і кіраўнічай працы і тым самым прыносіліся-б новыя думкі, новы стыль працы. Прапаноўвалася абмежаваць старшынства ў Галоўнай Управе трыма двуггадовымі тэрмінамі запар, для старшыняў аддзелаў – чатырма аднагадовымі тэрмінамі. Такое рашэньне было прынята, яно ўваходзіць у дзеяньне ад дня прыняцьця яго Кангрэсам.

Пратэст дэлегатаў Нью-Ёркскага аддзелу выклікаў напамін Вячкі Станкевіча аб выкананьні пастановы мінулага Кангрэсу аб пераліку аддзеламі БАЗА пэўных фінансавых сродкаў на рахунак Галоўнай Управы дзеля забесьпячэньня яе дзейнасьці. Было вырашана яшчэ раз удакладніць парадак і памеры такіх выплатаў.

У другой палове пасяджэньня адбыліся выбары новага старшыні Галоўнай Управы, на гэтую пасаду быў ізноў абраны сп. Вячка Станкевіч. Ён прапанаваў новы склад Галоўнай Управы БАЗА, за які прысутныя прагаласавалі: Алеся Кіпель, Сяргей Капытка, Тацьцяна Красоўская, Алла Орса-Романо, Сяргей Пятровіч, Валеры Дворнік, Ганна Сурмач, Ільля Куніцкі.

У новаабраную Рэвізійную камісію ўвайшлі: Натальля Брылеўская, Мікола Цімашэнка, Тацьцяна Кулакевіч.

Дэлегаты пажадалі новаабранаму кіраўніцтву БАЗА пасьпяховай дзейнасьці, каб наступныя два гады сталі дзейсным і адметным пэрыядам ў гісторыі Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня.

*Ганна СУРМАЧ*

Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:14 PM Page 5



# Беларусь за месяц

## Эўропа дае час

Камісар Эўразьвязу па пытаньнях вонкавых сувязяў і палітыкі добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр наведала Беларусь з аднадзённым візытам 22 чэрвеня. Яна сустрэлася з прадстаўнікамі апазыцыі (Лябедзькам, Казуліным, Вячоркам), міністрам замежных спраў Сяргеем Мартынавым, а таксама Аляксандрам Лукашэнкам.



Так, падчас асабістай сустрэчы кіраўнік краіны выказаў спадзеў, што эўракамісар “не пашкадуе, што прыехала ў Беларусь” ды паразважаў пра дачыненьні Беларусі і Эўропы: “Чаго мы хочам ад Эўропы? Каб эўрапейцы разумелі, што Беларусь — ня толькі геаграфічны цэнтар кантынэнту, тут жывуць вельмі прыстойныя, сумленныя, працавітыя людзі, тут існуе незалежная сувэрэнная дзяржава, і замахвацца на гэта, як-бы камусьці не хацелася, мы дазволіць ня можам”. Лукашэнка таксама зазначыў, што Беларусь “ня можа без супрацоўніцтва з Эўропай далей разьвіваць эканоміку”, а “фінансавыя рэсурсы, крэдытаваньне, фінансаваньне — таксама для нас найважнейшы фактар”.

Спн. Вальднэр ужо не настойвала на выкананьні патрабаваньняў ЭЗ у дачыненьні Беларусі, назваўшы гэтыя патрабаваньні “просьбамі”. Яна зазначыла, што “краіны-сябры Эўразьвязу раней зьвярнуліся да Беларусі з заклікам пра выкананьне шэрагу просьбаў”. Некаторыя зь іх былі выкананыя, але “некаторыя пажаданьні так і засталіся нявыкананымі”.

Экспэрты зазначаюць, што цяпер наўрад ці дэмакратызацыя Беларусі для Эўропы стаіць на першым пляне, хутчэй Брусэль перасьледуе геапалітычныя мэты.

Перад адлётам зь Беларусі Бэніта Фэрэра-Вальднэр усё-ж заявіла, што “Эўразьвяз чакае ад Беларусі працягу прагрэсу ў пяці асноўных галінах (рэформа выбарчага заканадаўства; забесьпячэньне свабоды аб’яднаньняў; стварэньне ўмоў для дзейнасці няўрадавых арганізацый, свабода прэсы; зьняцьце абмежаваньняў для свабоды асобы)”.

У сьнежні 2009 г. міністры краін Эўразьвязу павінны разглядзець пытаньне аб прыпыненьні санкцый у дачыненьні да Беларусі. Спн. Фэрэра-Вальднэр выказала ўпэўненасьць у тым, што да гэтага часу Менск працягне рэформы.

## Беларусь перамагла

Прынамсі так вынікае з падпісаных 17 чэрвеня пагадненьняў паміж Расспажыўнаглядам і Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчаваньня Беларусі. Кіраўнік Расспажыўнагляду Генадзь Анішчанка два тыдні ўпарта адмаўляўся прызнаваць права беларускай малочнай прадукцыі на расейскі рынак.

Згодна з падпісанымі 17 чэрвеня ў Маскве дамоўленасьцямі, прадугледжваецца, што да афармленьня пагадненьняў паводле новых рэглямэнтаў будуць дзейнічаць ранейшыя, і беларускія малочныя вырабы будуць пастаўляцца ў ранейшым аб’ёме. Выключэньне — сухое малако, якое ня будзе пастаўляцца ў Расею да 30 верасьня.

**Хроніка малочнай вайны**

*5 чэрвеня* Расея і Беларусь адкарэктавалі прагнозны балянс паставак беларускай малочнай прадукцыі ў РФ у 2009 г.;

*6 чэрвеня* Расспажыўнагляд забараніў увоз у Расею амаль 500 відаў беларускай малочнай прадукцыі. Прычына: беларускія вытворцы не пераафармілі дазвольную дакумэнтацыю ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі тэхрэглямэнту, які набыў моц яшчэ ў сьнежні 2008 г.

*8 чэрвеня* забаронены ўвоз у Расею яшчэ 593 найменьняў беларускай малочнай прадукцыі — амаль усёй беларускай малочнай прадукцыі.

*13 чэрвеня* Лукашэнка адмаўляецца ляцець у Маскву на саміт Арганізацыі Дамовы аб калектыўнай бясьпецы, адпаведна Беларусь не падпісвае дамоўленасьці аб далейшым існаваньні Анты-НАТА. На беларускіх тэлеканалах пачынаецца жорсткая крытыка Расіі.

*17 чэрвеня* Беларусь дэкляруе пра ўвядзеньне ўзмоцненага рэжыму кантролю за перамяшчэньнем грузаў на асноўных расійска-беларускіх магістралях.

*17 чэрвеня*, вечар. Расейскі газавы манапаліст загадвае Беларусі (прадпрыемству “Белтрансгаз”) выплаціць запазычанасьць у 230 мільёнаў даляраў за пастаўлены ў студзені — красавіку 2009 г. прыродны газ.

## Працэс пайшоў

20 чэрвеня вызначыліся першыя два кандыдаты ад дэмакратычных сіл на наступныя прэзыдэнцкія выбары. Напачатку ў Доме культуры Менскага трактарнага заводу прайшоў сход актыву сяброў Партыі БНФ. Яго, праўда, прабайкатавала частка актыву з рэгіёнаў ды прыхільнікі намесьніка старшыні Партыі БНФ Аляксея Янукевіча. Сход рэкамэндаваў кандыдатам ад дэмапазыцыі старшыню партыі Лявона Баршчэўскага.

Потым у той-жа залі прайшоў Кангрэс эўрапейскага выбару, на які сабраліся сябры незарэгістраванай Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі “Народная Грамада” Міколы Статкевіча, прадстаўнікі руху “Разам” Вячаслава Сіўчыка і беларускамоўнага прадпрымальніка Аляксандра Макаева, а таксама аргкамітэт сацыял-дэмакратычнай партыі “Свабода” былога дэпутата Сяргея Скрабца. Удзельнікі Кангрэсу абралі адзіным кандыдатам Міколу Статкевіча.

Цяпер сваіх дэмакратычных кандыдатаў павінны абраць Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы ды “Рух за Свабоду”.

## Зьезд беларусаў сьвету

Менгарвыканкам нарэшце прадаставіў памяшканьне для правядзеньня галоўнага форуму беларусаў сьвету. V зьезд пройдзе, як і папярэдні, у памешканьні Міжнароднага адукацыйнага цэнтру, што ў паўднёва-заходняй частцы сталіцы, 18—19 ліпеня. Удзел у форуме мяркуюць узяць больш за 400 дэлегатаў з 29 краін сьвету.

## Ці будзе дэнамінацыя?



У сярэдзіне чэрвеня ў беларускіх СМІ зьявілася інфармацыя, што ў Славаччыне адбітыя ўзоры беларускіх манэт наміналам 5, 10, 20, 50 капеек і 1 рубель. Кіраўнік упраўленьня інфармацыі Нацбанку Беларусі кажа, што сапраўды вывучаюцца магчымасьці розных манэтных двароў, але пакуль дэнамінацыі (скарачэньня колькасьці нулёў) не плянуецца, прынамсі, у гэтым годзе. Праўда, на згаданым манэтным двары запэўніваюць, што гатовыя да канца году адбіць 110 мільёнаў манэт.

## Паўлічэнка - у адстаўцы

Былы камандзір спэцыяльнага атраду хуткага рэагаваньня Дзьмітры Паўлічэнка, якога падазраюць у датычнасьці да зьнікненьня вядомых у Беларусі людзей (Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзмітрыя Завадзкага) сыйшоў у адстаўку. Афіцыйная прычына — праблемы са здароўем.

## Новы старшыня



Выканаўцам абавязкаў старшыні Менгарвыканкаму прызначаны Мікалай Ладуцька. Ён замяніў Міхаіла Паўлава, якому ўвесну зрабілі апэрацыю па выдаленьні пухліны галаўнога мозгу. Цяпер Паўлаў праходзіць курс рэабілітацыі ў Нямеччыне.

Мікалай Ладуцька нарадзіўся ў 1959 г. у Менску, за савецкім часам быў на камсамольскай працы, ад 1990 па 2003 г. быў у будаўнічым трэсьце, з 2003 г. кіраваў найбуйнейшым раёнам сталіцы — Фрунзенскім.

## Беларускі — чацьвертыя

На чэмпіянаце Эўропы па баскетболу, які прайшоў у чэрвені ў Латвіі, беларуская жаночая зборная заняла выніковае 4-е месца. Падапечныя Анатоля Буяльскага дайшлі да паўфіналу, дзе прайгралі Грэцыі, а ў матчы за 3-е месца — Гішпаніі. Тым ня менш гэта відавочны посьпех. Дзяўчаты гулялі ня ў лепшай форме, частка была траўмаваная. Да таго-ж беларускі, заняўшы 4-е месца, выканалі галоўную задачу — без адбору трапілі на чэмпіянат сьвету — 2010, як і пройдзе ў Чэхіі.

## Беларус выйграў Лігу чэмпіёнаў



Размова пра найлепшага футбаліста Беларусі Аляксандра Глеба. Яго “Барсэлёна” выйграла Лігу чэмпіёнаў, перамогшы ў фінале 27 траўня ўладальніка мінулага году — “Манчэстар Юнайтэд” зь лікам 2:0.

Глеб, праўда, ня быў заяўлены на матч. Дый справы яго ў “Барсе” складваюцца ня лепшым чынам. Напачатку сэзону ён атрымаў траўму, а калі вылечыўся, то ягонае месца ў паўабароне было занятае. Аляксандар правёў толькі палову матчаў за клюб. Ня выключана, што наступны сэзон ён адправіцца ў новую каманду. Беларусам цікавяцца “Баварыя”, “Шальке-04”, “Ліён”, “Астан Вілла”.

*Уласны карэспандэнт*

# Кангрэс БАЗА

*Заканчэньне з бачыны 1*

на тэрміны выкананьня абавязкаў старшыняў аддзелаў і старшыні ГУ, тры тэрміны па 2 гады — для страшыні ГУ, і чатыры тэрміны па 1 году — для старшыняў аддзелаў. Абмежаваньне тэрмінаў на кіраўнічых пасадах — важная мера ў практыцы кожнай арганізацыі, і яе ўвядзеньне павінна адбывацца належным чынам, са зьменамі ў Статуце. Аднак у абход існуючай працэдуры, апісанай у Статуце, старшыня ГУ В. Станкевіч, настойваў, што для гэтага дастаткова пастановы ГУ, якая можа быць зацьверджаная або адхіленая Кангрэсам. Пастанова ГУ аб увядзеньні абмежаваньня была прынятая ў красавіку сёлета. Усе бакі пытаньня аб увядзеньні абмежаваньняў на тэрміны кіраваньня не былі адпаведна разгледжаныя, адпаведнасьць гэтай меры Статуту БАЗА не прааналізаваная. У выніку дэкляратыўнае цьверджаньне сп. Станкевіча, што мера не датычыць Статуту і можа рэгулявацца пастановамі ГУ, узяла верх. Гэта дзіўна, бо на Кангрэсе нават не было поўнага тэксту вышэйзгаданай пастановы ГУ.

Паказальна, што значная колькасьць прысутных відавочна не да канца зразумелі палажэньні гэтай пастановы і тэрміны яе ўваходжаньня ў сілу. Згодна са Статутам усе зьмены павінны адбывацца пры абмеркаваньні загадзя сфармуляваных і распаўсюджаных тэкстаў паправак у пэрыяд між Кангрэсамі, і потым вырашацца праз галасаваньне на наступным Кангрэсе.

Тым ня менш у выніку галасаваньня большасьць галасоў была пададзеная за абмежаваньне тэрмінаў кіраваньня. Галоўная матывацыя — быццам за доўгі час пасады робяцца ўзурпаваныя кіраўнікамі. Аднак гэтая апінія цалкам ігнаруе тое, што выбары ў БАЗА адбываюцца праз дэмакратычныя адкрытыя выбары. Непажаданым вынікам такіх штучных абмежаваньняў, свайго роду affirmative action, можа быць тое, што на месца дасьведчаных, паказаўшых сябе кіраўнікоў арганізацыі могуць прыйсьці слабейшыя, некампэтэнтныя і няздатныя асобы.

Таксама не вытрымлівае крытыкі тлумачэньне, што пры адстаўцы дзейных кіраўнікоў, якія быццам сваім аўтарытэтам падаўляюць ахвочых да кіраўнічай працы, гэтыя “схаваныя” кандыдаты раптам матэрыялізуюцца і пяроймуць справу. Хутчэй ідзе пра іншае — пасады дастануцца асобам, якія дасюль па сваім узроўні не маглі параўнацца зь дзеючымі кіраўнікамі. І што менавіта для выдаленьня з грамадзкай дзейнасьці няўгодных дзеючых старшыняў аддзелаў і было сплянаванае гэтае штучнае абмежаваньне тэрмінаў.

Затым заслухалі справаздачы старшыні аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку, старшыні ГУ і прадстаўнікоў гурткоў у Вашынгтоне і Канэктыкуце.

Адбыліся выбары Старшыні Галоўнай Управы, якім быў пераабраны сп. Вячка Станкевіч (прапанаваны альтэрнатыўны кандыдат узяў самаадвод). Быў зацьверджаны склад ГУ, прапанаваны старшынём, і абраныя сябры Статутовай камісіі. Пасады ў ГУ захавала большасьць сяброў з папярэдняга тэрміну. Стаць скарбнікам ГУ пагадзіўся сёнешні скарбнік Нью-Ёркскага аддзелу Сяргей Пятровіч.

Пад канец было прагаласавана за тое, што адлік тэрміну знаходжаньня на пасадзе для дзеючых цяпер старшыняў аддзелаў і ГУ робіцца з моманту прыняцьця пастановы ГУ пра абмежаваньні (красавік 2009), а не ад моманту абраньня сёньняшніх кіраўнікоў на пасаду, як прапаноўвалася Галоўнай Управай да гэтага.

Былі абмеркаваныя пляны на будучыню арганізацыі.

**Віталь ЗАЙКА**

Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:15 PM Page 6



# Каляндар “БЕЛАРУСА”

**11 ліпеня 1969 г** . у Мэльбурне (Аўстралія) памёр грамадзкі дзеяч **Данат Яцкевіч**. Нарадзіўся ён у 1922 г. у Лідзе, быў сынам беларускага сьвятара Мадэста Яцкевіча. Падчас нямецкай акупацыі – павятовы старшыня ў Лідзе.



*Данат Яцкевіч з сынам Антонам, зьлева – Надзея Груша з сынам, справа – Эўлялія Яцкевіч.*

Да. Яцкевіч прыехаў у Аўстралію ў 1949 г. Напачатку жыў у Брысбэне (штат Куінслэнд), дзе заснаваў праваслаўнае Брацтва БАПЦ сьв. Юрыя, Згуртаваньне Беларускіх Вэтэранаў, выдаваў часапіс “Лучнік”, нават пісаў дзіцячыя п’есы пад псэўданімам Данат Баян.

У 1956 г. разам з жонкаю, таксама грамадзкай дзяячкай, настаўніцай Эўляліяй Яцкевіч перабраўся ў Мэльбурн, дзе таксама браў актыўны ўдзел у беларускім грамадзкім жыцьці. Паралельна зрабіў добрую кар’еру ў чыгуначным упраўленьні штату Вікторыя. Памёр, не дажыўшы і да 50 гадоў – спынілася сэрца.

50 гадоў таму, **21 ліпеня 1959 г.**, памёр **Уладзімер Кабушка**. Нарадзіўся ў 1910 г. на Слонімшчыне. За польскім часам браў удзел у беларускім руху, за што быў арыштаваны і асуджаны на восем гадоў турмы. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у беларускім камітэце ў Кёнігсбэргу, па вайне настаўнічаў у ДП лягерох. Затым перабраўся ў ЗША, дзе таксама браў удзел у беларускім руху, быў сябрам БАЗА.

**27 ліпеня 1969 г.** памёр **Яўхім Кіпель** – вайсковец, грамадзкі дзеяч, навуковец. Ваяваў у царскай арміі, падчас грамадзянскай вайны добраахвотна ўступіў у Чырвоную, даслужыўся да пасады начальніка штабу асобнай кавалерыйскай брыгады. Ад 1920 г. у Менску. Працаваў у Тэрміналягічнай камісіі, Інбелкульце, браў удзел у падрыхтоўцы падручнікаў. У 1930 г. быў арыштаваны і на пяць год высланы ў вяцкую вобласьць. У 1935 г. арыштаваны паўторна і зноў асуджаны на пяць год. У Беларусь вярнуўся толькі ў 1942 г. Працаваў у “Голасе вёскі”, школьным аддзеле, быў старшынём Другога Ўсебеларускага кангрэсу. Ад 1950 г. жыў у ЗША (Пасэйк). Трымаўся кірунку БЦР, уваходзіў у арганізацыю Амэрыканскія Прыхільнікі БЦР.




*Магіла Яўхіма і Марыі Кіпеляў на беларускіх могілках у Саўт-Рывэры.*

60 гадоў таму, **31 ліпеня 1949 г.**, на сходзе беларускіх дзеячоў у Нью-Ёрку было створана **Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА)**, якое стала адной з найгалоўных беларускіх арганізацый у Амэрыцы. У ліпені 1950 г., арганізацыя была зарэгістраваная ўладамі штату Нью-Ёрк. У першую Галоўную Ўправу ўваходзілі: Мікола Гарошка (старшыня), Янка Станкевіч і Мікола Дарашэвіч (намесьнікі), Уладзімер Машанскі, Янка Ніхаёнак, Міхась Тулейка.

Кіраўнікамі БАЗА былі Франц Кушаль, Міхась Тулейка, Мікола Кунцэвіч, Кастусь Мерляк, Стась Станкевіч, зноў Мікола Гарошка, Расьціслаў Гарошка. Цягам трыццаці гадоў (1975—2007) кіраваў арганізацыяй Антон Шукелойць, цяпер – Вячка Станкевіч.

***АГ***

# Посьпехі Антося Вараб’я

Антось Варабей, студэнт Гуэлфскага ўнівэрсытэту, беларус, які жыве ў Таронта, перамог у прэстыжнай роварнай гонцы па шашы “Toronto Criterium”, якая праходзіла 29 травеня ў цэнтры г. Таронта. Праз тыдзень, 7 чэрвеня ён перамог у чарговым этапе Кубка Антарыё па горным ровары, які праходзіў у Лёндане.

Сваю багатую калекцыю мэдалёў ды прызоў Антось Варабей пачаў зьбіраць з 2002 году, калі яшчэ падлеткам з самадзейнай камандай сваіх сяброў упершыню прыняў удзел у найцяжэйшым суткавым маратоне “24 Hours of Adrenalin” – тады й “захварэў” на горны ровар. Ад таго часу ён актыўна трэніруецца ды амаль штотыдня бярэ ўдзел у рознага ўзроўню спаборніцтвах, у якіх нязьменна займае прызавыя месцы. І нават цяжкая хвароба на рак (аб чым тады пісалася ў газеце “Беларус”) у 2004-05 г.г. не змагла спыніць ягонага імпэту. Адначасова з курсам лячэньня Антось працягваў і заняткі спортам, і здачу выпускных іспытаў у Школе мастацтваў Этобіка, дзе ён атрымоўваў сярэднюю адукацыю. Пераадолеўшы хваробу цалкам, ён закончыў школу на выдатна з тытулам “Лепшы спартовец школы” ды з посьпехам быў прыняты ў Гуэлфскі ўнівэрсытэт на факультэт ляндшафтнай архітэктуры. З гэтае прычыны ў той цяжкі для яго выпускны год Таронтаўскае упраўленьне школ адзначыла Антона Вараб’я Ўзнагародай ад Нігеля Ўільямса “За пэрсанальную сілу й мужнасьць”.

Ва ўнівэрсітэце Антось адразу заняўся стварэньнем Клюбу па горным ровары, якога там дагэтуль не было. У 2008 годзе, увосень, каманда ўнівэрсытэцкага Клюбу, бясспрэчным і шаноўным лідэрам каторай стаўся Антось, выйграла Кубак Антарыё сярод унівэрсытэтаў. Сам-жа Антось у асабістым заліку заняў другое месца.

Праўда, летась асабісты рэйтынг па горным ровары спартоўца Антося Вараб’я быў значна паніжаны, бо юнак выяжджаў у Аўстрыю для навучаньня ў Венскім унівэрсытэце ды вярнуўся адтуль толькі ў канцы сэзону. Але і ў Вену ён захапіў з сабой свой улюбёны ровар ды працягваў трэніроўкі па Альпійскіх горах. Напэўна, высакагорная практыка і дапамагла яму гэтак пасьпяхова адганяцца ўвосень 2008 г. ды пачаць сэзон 2009 году. Антось вырашыў сёлета паспрабаваць свае сілы і ў гонках па шашы і адразу-ж выйграў два мэдалі, залаты й сярэбраны.

Жадаем Антосю Вараб’ю, беларускаму спартоўцу ў Канадзе, новых перамог!



***I. A.***

# Справаздача Дзярждэпартамэнту

Дзяржаўны дэпартамэнт ЗША абнародаваў справаздачу аб пашырэньні свабоды і дэмакратыі ў сьвеце.

У дакумэнце зьвяртаецца ўвага на высілкі Злучаных Штатаў, скіраваныя на спрыяньне дэмакратычным пераменам і захаваньню правоў чалавека ў недэмакратычных краінах. Беларусь – у ліку 106 краінаў, сытуацыя ў якіх аналізуецца ў справаздачы .

Палітычная сытуацыя і сытуацыя з датрыманьнем правоў чалавека ў Беларусі мае ў справаздачы традыцыйныя характарыстыкі. У прыватнасьці, адзначаецца аўтарытарны характар палітычнага рэжыму і падкрэсьліваецца, што ў 2008 годзе працягваліся незаконныя арышты і перасьлед грамадзянаў з палітычных прычын.

Сытуацыя з правамі чалавека, нягледзячы на паасобныя пазытыўныя факты, згодна з ацэнкаю Дзярждэпартамэнту ЗША, застаецца вельмі кепскай. “Варожасьць беларускага рэжыму да дэмакратыі і правоў чалавека, спалучаная з амаль поўнай манаполіяй дзяржавы на сродкі масавай інфармацыі, стварыла атмасфэру страху і рэпрэсіяў”.

Мэты, якія ставяць перад сабою ЗША ў адносінах да Беларусі, вынікаюць з прынятага ў 2007 году Акту аб пашырэньні дэмакратычных каштоўнасьцяў. У прэамбуле, абнародаванай справаздачы запісана, што ЗША канцэнтруюць высілкі па ўзмацненьні ключавых выбарчых, інстытуцыйных і сацыяльных складнікаў, важных для разьвіцьця дэмакратыяў. Гаворка ідзе пра захады для забесьпячэньня свабодных выбараў, які ўключае ў сябе ня толькі празрыстае галасаваньне і сумленны падлік галасоў, але й рэальную канкурэнцыю падчас перадвыбарнай кампаніі.

Злучаныя Штаты адзначаюць свой удзел у разьвіцьці і ўзмацненьні дэмакратычных партыяў і грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі. Апошнімі гадамі ЗША далі дапамогу для паляпшэньня арганізацыйных і тэхнічных магчымасьцяў дэмакратычных партыяў, а таксама прычыніліся да лепшай каардынацыі дзеяньняў названых партыяў і арганізацыяў трэцяга сэктару. ЗША працягвалі захады для паляпшэньня доступу жыхароў Беларусі да альтэрнатыўных крыніц інфармацыі. Адзначаючы ўдзел Злучаных Штатаў у рэалізацыі адукацыйных праграм, Дзярждэпартамэнт піша пра фінансавую дапамогу для адукацыі 1800 чалавек ва ўнівэрсытэце, які аднавіў сваю дзейнасьць у суседняй зь Беларусьсю краіне – гаворка, відавочна, ідзе пра Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт. У справаздачы таксама адзначаецца, што Злучаныя Штаты забясьпечылі дапамогаю больш як 90 беларускіх няўрадавых арганізацыяў.

Трэба дадаць, што дзеяньні ЗША у адносінах да Беларусі ўкладаюцца ў рамкі палажэньняў Акту аб дэмакратыі ў Беларусі, прынятага Кангрэсам ЗША ў 2004 годзе. У 2006 годзе дзеяньне гэтага Акту было падоўжана.

## Рашэньне прэзыдэнта

Прэзыдэнт ЗША Барак Абама 12 чэрвеня на год прадоўжыў дзеяньне ўказу пра арышт уласнасьці “шэрагу асоб, якія падрываюць дэмакратычныя працэсы ў Беларусі”, што знаходзіцца на тэрыторыі ці пад юрысдыкцыяй ЗША.

Як зазначае прэс-служба Белага дому, Абама накіраваў паведамленьне, у тым ліку ў Кангрэс ЗША, у якім адзначыў наяўнасьць “некаторых пазытыўных зьменаў за мінулы год” у Беларусі.

Ён зьвярнуў увагу на вызваленьне ўсіх міжнародна прызнаных палітычных зьняволеных. “Але нягледзячы на гэта, дзеяньні і палітыка пэўных членаў ураду, і іншых людзей, якія падрываюць дэмакратычныя працэсы, парушаюць правы чалавека і ўцягнутыя ў дзяржаўную карупцыю, маюць надзвычайную пагрозу нацыянальнай бясьпецы і міжнароднай палітыцы ЗША. Па гэтых прычынах я вырашыў, што неабходна прадоўжыць дзеяньне ўказу аб блякаваньні ўласнасьці”, — гаворыцца ў дакумэнце.

Указ пра фінансавыя санкцыі ў дачыненьні да дзесяці беларускіх чыноўнікаў быў падпісаны папярэднім прэзыдэнтам Джорджам Бушам 16 чэрвеня 2006 году і з таго часу прадаўжаецца штогод.

Да ўказу прыкладаецца сьпіс зь дзесяці прозьвішчаў, у іх ліку — Аляксандар Лукашэнка і яго сын Віктар Лукашэнка, намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальля Пяткевіч, міністар юстыцыі Віктар Галаванаў, старшыня Белдзяржтэлерадыёкампаніі Аляксандар Зімоўскі, кіраўніца ЦэнтрвыбракамуЛідзія Ярмошына.

У сьпіс таксама ўваходзяць асобы, якія на гэты час пазбавіліся сваіх пасадаў, — гэта былыя старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка, дзяржсакратар Савета бясьпекі Віктар Шэйман, міністар унутраных спраў Уладзімер Навумаў і камандзір брыгады спэцназу ўнутраных войскаў МУС Дзьмітры Паўлічэнка.

***Паводле Радыё Свабода***

Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:15 PM Page 7



Вескі й Паведамленьні

Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня
Viestki j Paviedamlenni
Belarusan American Association, Inc.
166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org № 7 (522)

# Чэрвеньскі сход аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку

У нядзелю, 14 чэрвеня 2009 г., адбыўся чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка выступіў з кароткім аглядам падзеяў у Беларусі за апошнія некалькі тыдняў. У прыватнасьці, былі закранутыя наступныя тэмы: “малочная” вайна паміж кіраўніцтвам Беларусі і Расеі, жорсткі абмен абвінавачаньнямі паміж імі, адмова Беларусі ўдзельнічаць у паседжаньні абароннай арганізацыі постсавецкіх краінаў у справе сілаў хуткага рэагаваньня, увядзеньне элементаў памежнага і мытнага кантролю на беларуска-расейскай мяжы. Сярод іншых падзеяў ўзгаданы зварот 200 беларускіх грамадзкіх і культурных дзеячоў да кіраўніцтва Беларусі з заклікам спыніць вынішчэньне беларускай мовы; прагненьне прэзыдэнтам Абамам яшчэ на год арышту ўласнасьці асобаў, якія чыняць уціск правоў чалавека і дэмакратычных свабодаў у Беларусі; сэнатар Макейн выступіў з прапановай аб захадах супраць палітыкі аднаўленьня расейскага імпэрыялізму; у амэрыканскай амбасадзе ў Беларусі дасюль дыпляматычны пэрсанал абмежаваны 5-ю асобамі, у ліпені чакаецца новы часовы паверані замест ад’яжджаючага Дж. Мура.

## А. Шукелойць: Другі Ўсебеларускі Кангрэс як выяўленьне волі народу



Затым, у сувязі з 65-годзьдзем Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, з гутаркай аб ім выступіў сп. Антон Шукелойць. Ён сказаў, што ня толькі быў сьведкам падзеяў Кангрэсу, але быў зьвязаны з ягонай працай як дэлегат і як асоба, адказная за абраньне дэлегатаў ад Палесься.

Напачатку сваёй гутаркі прамоўца спыніўся на некалькіх момантах, зьвязаных з нямецкай акупацыяй Беларусі. Ён адзначыў тры перыяды, на якія можна падзяліць час акупацыі: кіраваньне Вэрмахту, пэрыяд нямецкай цывільнай адміністрацыі пад кіраваньнем В. Кубэ, і пэрыяд кіраваньня СС на чале з Готбэргам. Падчас першага прыяду былі адкрытыя адабраныя бальшавікамі цэрквы і касьцёлы, насельніцтва зьбольшага прыхільна сустракала немцаў, спадзявалася на спыненьне бальшавіцкай сваволі і ўсталяваньне нармальнага парадку. На пасады ў мясцовай адміністрацыі былі прызначаныя беларускія нацыянальныя дзеячы. Потым зьявілася нямецкая цывільная адміністрацыя начале з рэйхскамісарам Вільгельмам Кубэ. Ён быў надзвычай прыхільны да беларусаў, і, на маю думку, быў забіты немцамі або зь ведама немцаў. Пасьля забойства Кубэ генэральным камісарам стаў Готбэрг, настаў пэрыяд “акупацыі СС”. Готбэрг быў, як цяпер ведаем, стваральнікам палітыкі вынішчэньня мірнага насельніцтва як сродку антыпартызанскіх акцыяў. Готбэрг быў прыхільны да палякаў, і падчас мабілізацыі ў створаную Беларускую Краёвую Абарону (БКА) на ўсім абшары Лідчыны, Ашмяншчыні, Смаргоньшчыны па тайнай дамове з палякамі мабілізацыі ў БКА не было, затое мабілізацыю правяла польская Армія Краёва.

Наогул, увесь час беларускае кіраўніцтва мусіла лавіраваць, бо немцы не падтрымлівалі незалежнасьці Беларусі. У прапагандыскіх мэтах заяўлялася, што Беларусь “зойме належнае месца ў Новай Эўропе”, але што гэта за “месца”, было незразумела, пра незалежнасьць нічога не казалася. Калі расейцы прасунуліся пад Менск, немцы дазволілі правядзеньне Ўсебеларускага Кангрэсу, але беларускім нацыянальным дзеячам давялося далей пераадольваць перашкоды, што, згодна з нямецкай дактрынай, існавалі ад самага пачатку акупацыі. Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР) як кіруючы ворган беларускай адміністрацыі, створаная ў сьнежні 1943 г., ажыцьцяўляла падрыхтоўку да Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, абраньне дэлегатаў на яго. Я быў пасланы ў Ганцавіцкую акругу арганізоўваць выбары дэлегатаў. Гэтая частка Палесься была ахопленая савецкай партызанкай, дабіраўся праз Баранвічы. Немец з акруговага камісарыяту казаў, “першы раз бачу чалавека, у цывільнай вопратцы, што дабраўся да нашых краёў”. Езьдзіў па 5 раёнах Ганцавіцкай акругі, у выніку ад акругі было абрана 25 дэлегатаў, 20 зь якіх прыехалі на Кангрэс. Усяго ў Кангрэсе брала ўдзел 1039 чалавек ад усіх беларускіх этнічных тэрыторыяў, улучна зь Вільняй, Беласточчынай, Смаленшчынай, Дзьвіншчынай. Прэзыдэнтам Кангрэсу быў абраны Яўхім Кіпель.

Кангрэс адбыўся 27 чэрвеня 1944 году, і стаў сапраўднай маніфэстацыяй волі беларускага народу да сувэрэнага жыцьця, нават у найцяжэйшых умовах акупацыі і збройнага супрацьстаяньня на абшары Беларусі двух варожых беларусам таталітарных рэжымаў – гітлераўскага і сталінскага. Пры складаньні галоўнага рэфэрату Кангрэсу, прачытанага прэзыдэнтам БЦР Радаславам Астроўскім, былі скарыстаныя матэрыялы пра народнае мастацтва, беларускую культуру, ахову помнікаў старасьвеччыны, якія былі падрыхтаваныя мною. Рэфэрат Астроўскага таксама ўлучаў разьдзелы пра мэты Кангрэсу, пра час паміж Першым і Другім Кангрэсамі, пра бягучы момант. У канцы было заяўлена, што БЦР складае свае паўнамоцтвы перад Кангрэсам і перадае ў рукі ўдзельнікаў Кангрэсу лёс Бацькаўшчыны. Затым адбыліся выступы ў дыскусіі, і былі прачытаныя рэфэраты ў справе адкіданьня пастановаў савецкага і польскага ўрадаў у справе Беларусі (адвакат Мікола Шкялёнак) і аб канчатковым разрыве Беларусі з Масквой (Аўген Калубовіч). Прысутныя затым прынялі рэзалюцыю, якая пацьвердзіла Акт 25 Сакавіка 1918 году, і прызнала ня маючымі сілы ўсе праўныя акты адносна Беларусі, зробленыя польскім і савецкім урадамі.”

Далей сп. Шукелойць спыніўся на прамове Аляксея Анішчыка (Чэмера) у справе супрацьдзеяньня польскім акцыям на частцы тэрыторыі Беларусі. Дзеля прa-польскай пазыцыі нямецкіх уладаў і Готбэрга, прэзыдэнт Кангрэсу Я. Кіпель мусіў афіцыйна дыстанцыявацца ад прамовы Анішчыка, але сама прамова была падрыхтаваная і прагучэла менавіта дзякуючы такім нацыянальным дзеячам, як Я. Кіпель.

Іншым цікавым момантам быў неажыцьцёўлены плян Беларускай Незалежніцкай Партыі адносна захопу ўлады на Кангрэсе і непасрэднага абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Плян палягаў у тым, каб з дапамогай беларускага батальёну Рагулі перабіць прыутных немцаў і заявіць аб пераняцьці ўлады беларускімі сіламі. Дзеля перадыслякацыі батальёну, што адбылася перад Кангрэсам, плян не спрацаваў. Таксама сп. Шукелойць спыніўся на т. зв. прывітальнай тэлеграме Гітлеру, якая была напісаная пад нямецкім ціскам пасьля Кангрэсу і прыняцьце якой было адсутнае ў яго праграме.

Гаворачы аб значаньні, якое меў Другі Ўсебеларускі Кангрэс, сп. Антон Шукелойць падкрэсьліў, што Другі Ўсебеларускі Кангрэс, у якім бралі ўдзел шэраг дэлегатаў Першага Кангрэсу (Р. Астроўскі, К. Езавітаў, Я. Станкевіч, М. Шыла, Ф. Яраміч, А. Будзька, Н. Паваротная) у першым пункце рэзалюцы прызнаў Акт 25 Сакавіка. Фактычна беларускі нацыянальны актыў выявіў волю шматлікіх пакаленьняў змагароў за незалежнасьць, волю людзей, што былі ўзгадаваныя ў беларускім духу праз школьніцтва, патрыятычныя арганізацыі кшталту СБМ. На незалежніцкіх ідэалах, нягледзячы на вайну і акупацыю, былі ўзгадаваныя тысячы і дзясяткі тысяч людзей. Адбылося аднаўленьне царквы, быў абвешчаны супраціў, у тым ліку збройны, маскоўскай акупацыі, які трываў аж да сярэдзіны 1950-х гг. Вялікая роля Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ў кансалідацыі беларускіх сілаў перад выездам на Захад. Дзякуючы гэтай кансалідацыі пасьля вайны стварылася беларуская эміграцыя, што падтрымлівала ідэалы незалежнасьці й нацыянальнай культуры. Да таго часу былі эмігранты зь Беларусі, было іх шмат, але беларускай эміграцыі не было. Беларускія нацыянальныя дзеячы здолелі ў тых ненармальных умовах, сярод крыві й агню пацьвердзіць шлях да незалежнасьці.”

## З. Пазьняк: гэта была найбольш подлая вайна



Старшыня Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк перад сваім паведамленьнем пра падзеі ў Беларусі выступіў з развагамі пра Другі Ўсебеларускі Кангрэс і пра нацыянальных дзеячоў у часы Другой сусьветнай вайны ў Беларусі.

Ён у прыватнасьці сказаў: “Чаму расейцы дасюль імкнуцца апаганіць беларускі нацыянальны рух часоў Другой сусьветнай вайны? Прычына ў тым, што фактычна ў той час ішлі дзьве вайны. Першая – на тэрыторыі Беларусі змагаліся немцы і Саветы: наступалі і адступалі дывізіі, партызаны падрывалі цягнікі, і г. д. І поруч з гэтым ішла другая вайна. Дакладней, працягвалася вайна расейскага бальшавізму па вынішчэньні беларускага народу. Пачатак яе – у канцы 1920-х, барацьба з “нацдэмаўшчынай”, потым крывавы тэрор НКВД ў 1930-я, вялікія і малыя Курапаты па ўсёй Беларусі аж да прыходу немцаў. І тады – найбольш подлая вайна, калі вынішчэньне беларускага народу было працягнутае Саветамі ўжо з “пераводам стрэлак” на немцаў. Савецкія партызаны сьвядома правакавалі эскаляцыю тэрору, змушаючы беларускае жыхарства пакідаць свае паселішчы і далучацца да савецкай партызанкі. Рабілася гэта таксама дзякуючы дубаломнай і злачыннай палітыцы немцаў, якія палілі вёскі па малейшых падазрэньнях у сувязі з партызанамі. А часта толькі таму, што партызаны наўмысна падкідалі пад вёску забіта-

Заканчэньне на бачыне 6

**Наступны сход**

нью-ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **12 ліпеня 2009 году** ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага па адрасу:
*166-34 Gothic Drive, Jamaica, NY 11432*
Даезд цягнікомі падземкі **F** да прыпынку **169th St**; адтуль 2 блёкі да скрыжаваньня **167-й вул.** і **Готык Драйв.** Пачатак сходу а 1:00 папаўдні.

**Уплаты ў нью-ёрскі аддзел дасылайце на адрас:**
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 230249*
*Brooklyn, NY 11223*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:15 PM Page 8



# Рэцэнзія




*Marek Cabanowski.* **Zapomniany bohater general Stanislaw Bulak-Balachovicz.** Grodzisk Mazowiecki, Польшча6 2000 г. 232б.

*Балахович Булак,*
*Атоман наш лихой!*
*Только слова скажи,*
*Мы пойдём за тобой...*
***Песьня балахоўцаў***

Пасьля Першай сусьветнай вайны па лясных маёнтках Заходняй Беларусі і на Валыні пасялілася шмат людзей, якія называлі сябе "балахоўцамі". Мелі яны пераважна расейскія празьвішчы, гутарылі паміж сабою па-расейску і сьпявалі лірычна-патрыятычныя песьні, як напрыклад:

Россия, Россия,
Велика держава!
Зачем ты, Россия,
Войну проиграла?
Ведь мы воевали,
Мы кровь проливали...

Назва "балахоўцы" паходзіць ад імя іх камандуючага генэрала Станіслава Булак-Балаховіча. Нарадзіўся ён ў маёнтку Мейшты на паўднёвым захадзе ад Браслава. А ў блізкім Стокапіеве ягоны бацька меў фальварак. Жыцьцё маладога Станіслава было зьвязана з маёнткамі Юдычына (на Шаркоўшчыне), Самалішкі. Ягоныя бацькі хацелі, каб Станіслаў стаў ксяндзом, але ён стаў аграномам. А лёс пакіраваў яго на цяжкую жаўнерскую дарогу.

20.08.1914 г. ён уступіў дабраахвотнікам у царскае войска. Браў удзел у баях зь немцамі. Быў некалькі разоў паранены, а за адвагу атрымаў шмат адзнакаў, сярод якіх Крыж сьв. Георгія 3-й ст. і сьв. Ганны 3-й і 4-й ст. Пасьля Кастрычніцкага перавароту ў ранзе падпалкоўніка арганізаваў свой аддзел, які ваяваў з бальшавікамі каля Пскову, а пасьля ў Эстоніі, дапамагаючы эстонцам у барацьбе за незалежнасьць. Адным з вышэйшых афіцэраў у ягоным аддзеле быў ягоны брат Язэп.

З Эстоніі генэрал Булак-Балаховіч пераехаў у ваколіцы Берасьця, дзе павялічыў аддзел дабраахвотнікамі беларусамі, украінцамі і палоннымі чырвонаармейцамі. А ў 1920 г. ён імкнуўся навязаць стасункі зь беларускім урадам, нават назваў свой аддзел "беларускім". Балахоўцы бралі ўдзел у польска-савецкай вайне ў 1920-21 гадох, ваявалі на Палесьсі ў ваколіцах Пінску, Камень-Кашырскага, Лунінца, Мазыра.

Дзеля таго, што сярод балахоўцаў былі расейцы, беларусы і ўкраінцы, беларускі ўрад і рускі камітэт пад кіраўніцтвам Барыса Савінкава імкнуліся падпарадкаваць іх свайму кіраваньню. Палякі таксама былі неабыякавымі. У рэшце рэшт, генэрал Булак-Балаховіч падпарадкоўваўся то адным, то другім. Аднак у душы і ў сэрцы генэрал усё-ж быў беларусам. 12.11.1920 г. у Мазыры ён агалошвае незалежнасьць Беларусі і распачынае фармаваньне незалежнага беларускага войска. А праз чатыры дні быў створаны беларускі ўрад, у які, між іншым, увайшоў і Радаслаў Астроўскі.

Цікава ведаць якое было стаўленьне Саветаў і палякаў да Беларусі ў тыя цяжкія гады. А яны абодвыя хацелі мець Беларусь пад сваёю ўладаю. Падчас мірных перамоваў у Рызе ў 1921 г. палякі маглі атрымаць большую частку Беларусі ўключна зь Менскам, але яны хацелі мець у сваёй дзяржаве толькі абмежаваную колькасьць беларусаў, г. зн. столькі, колькі яны маглі асыміляваць.

Ужо пасьля ганебнага Рыскага пагадненьня войскі, якія ваявалі разам з палякамі супраць Саветаў, у тым ліку і генэрала Булак-Балаховіча, былі расфармаваныя і адпраўленыя ў лягеры. Па звальненьні адтуль балахоўцы ўладкаваліся на працы пераважна ў лясных маёнтках Заходняй Беларусі.

Варта тут узгадаць, што Саветы дамагаліся, каб палякі выдалі ім гэтмана Сьцяпана Пятлюру, генэрала Булак-Балаховіча і іншых кіраўнікоў антысавецкага змаганьня. Гэтман С. Пятлюра быў змушаны пакінуць Польшчу. Ён выехаў у Парыж, дзе і быў забіты ў 1926 годзе куляй савецкага агэнта Шварцбарда.

Генэрал Булак-Балаховіч застаўся ў Польшчы, бо лічыў сябе палякам і меў польскае грамадзянства. Аднак і ў Польшчы былі пакушэньні на ягонае жыцьцё з боку савецкіх агэнтаў. У адным нападзе, праз памылку агэнта, загінуў ягоны брат Язэп. Гэта адбылося ў ноч з 12 на 13 чэрвеня 1923 году каля Гайнаўкі на Беласточчыне. Трэба дадаць, што генэрал Язэп Булак-Балаховіч лічыў сябе беларусам, аб чым сьведчаць дакумэнты.

Генэрал С. Булак-Балаховіч напісаў дзьве кнігі на польскай мове. Пісаў ён і па-беларуску, нават вершы. Адзін зь іх у перакладзе на польскую мову цытуецца ў рэцэнзаванай кнізе на бач. 110.

Ваюючы на абшарах Беларусі, генэрал спрычыніўся да выданьня беларускіх паштовых марак. Выявы трох зь іх ёсьць у кнізе. Было-ж выдадзена найменш восем марак. Тры мелі надпіс "Беларусь", і пяць "БНР". Першы каталёг, які даў клясыфікацыю гэтых марак, быў каталёг братоў Сэнф, падрабязьней у "Gebruder Senfs illestrierter Postwertzeichen", каталёг 1921, б. 1227.

Генэрал Булак-Балаховіч быў, бясспрэчна, адважным і добрым ваяром, якога паважалі і любілі падначаленыя жаўнеры, якія далі яму мянушку "бацька". Але з камуністамі ён быў бескампрамісным і бязьлітасным.

У некаторых выпадках, на маю думку, ён быў загадкавай асобай. Народжаны ў Беларусі, ён уважаў сябе за польскага патрыёта. Супрацоўнічаў то зь беларусамі, то з расейцамі, але перад усім з палякамі.

Ягоны род паходзіў, відавочна, ад татараў, аб чым сьведчыць татарскае слова "булак" у прозьвішчы. Акрамя гэтага ў царскіх дакумэнтах ён часьцей запісаны як "Станіслаў Булак-Бэй-Балаховіч". А тытул "бэй", як вядома, даецца мусульманскім правіцелям.

Кніга аб генэралу Станіславу Булак-Балаховічу цікавая для ўсіх, але найперш беларускім гісторыкам, бо ў ёй ёсьць шмат фатаздымкаў, дакумэнтаў і вялікая бібліяграфія. Не зашкодзіла-б мець пераклад кнігі на беларускую мову.

***Міхась ШВЭДЗЮК, Англія***

## Чэрвеньскі сход аддзелу БАЗА

*Заканчэньне з бачыны 5*

га немца або рабілі падобныя да гэтага правакацыі, за якія расплочваўся нявінны беларускі селянін.

Паказальна, што ўсе падпольныя і партызанскія групы, якія былі створаныя не пад кантролем НКВД і засланцаў з-за лініі фронту – проста вынішчаліся. Таксама вынішчалася дашчэнту ўсё, што было зьвязанае зь беларускай культурай, зь беларускім нацыянальным рухам. Маскве была патрабная выпаленая, "зачышчаная" зямля – і яны зрабілі яе, рукамі немцаў. Людзі імкнуліся ратавацца, хто ішоў у атрады на абароне ад партызанаў, а хто ішоў да партызанаў. Тыя, што ішлі ў партызаны – або гінулі, або заставаліся нікім. А кіравалі – расейцы, і тыя хто выракся ўсяго беларускага, "людзі асобага складу", Лівенцавы з Машэравымі і Казловымі.

Потым Саветы мабілізавалі дзясяткі тысячаў "вызваленых" беларусаў і адразу кінулі на фронт, часта без вайсковай падрыхтоўкі, часам бяз зброі, паставіўшы за імі загарадатрады. Я добра ведаю пра гэта, бо з гэтым зьвязана і гісторыя маёй сям'і, лёсы майго бацькі й яго брата.

Казлоў, які жыў з двума мэдсёстрамі-наложніцамі і пасьля застрэліў абедзьвых; Лівенцаў, што без суду і сьледства загадваў забіваць беларусаў; Машэраў, што на дух не цярпеў нічога нацыянальна беларускага – вось тыя, хто прыйшоў пасьля вайны кіраваць спустошаным, выпаленым краем. Для іх кожны, хто размаўляў па-беларуску, быў нацыяналістам і значць – ворагам. Праводзілася татальная русыфікацыя, што працягваецца і сёньня. Рабілася ўсё, каб вынішчыць беларускую мову, традыцы, гістарычную памяць. І вось таму ідзе аплёўваньне, вось таму беларускаму руху закідаюць абвінавачаньні ў фашызме і г. д. Ігнаруюцца факты, што беларускія нацыянальныя дзеячы ратавалі суайчыньнікаў, пры тым не толькі беларусаў, а таксама гэбраяў. Фізычна вынішчаюцца знакі памяці – як помнік школьніку Лапіцкаму, што быў расстраляны пад Мядзелам. Той зьнішчаны помнік, як і татальная русыфікацыя, і той факт, што ЮНЭСКА сёньня залічае беларускую да зьнікаючых моваў – вось сьведкі іхнай подлай вайны супраць Беларусі. Другая сусьветная вайна – вялізная трагедыя, у якой бяруць пачатак шмат якія з нашых бедаў. Таму мы павінны вярнуцца да падзеяў тых часоў. Мы павінны ведаць усё і даць належную ацэнку ўсім і кожнаму. Мы ня зможам здабыць лепшую будучыню, ня ведаючы сваёй мінуўшчыны. А пакуль – гаварысь на сваёй мове – гэта і ёсьць барацьба.

## З. Пазьняк: за культуру, калі яе нішчаць , трэба змагацца

Затым сп. Пазьняк спыніўся на двух асноўных падзеях апошніх месяцаў, што зьвязаныя з палітыкай у Беларусі. Гэта пляны Эўразьвязу на супрацоўніцтва з Беларусьсю па прагараме "Ўсходняе партнэрства" і крызіс у адносінах паміж Беларусьсю і Расеяй. Нешта падобнае да "Ўсходняга партнэрства" Захад праводзіў у часы "Салідарнасьці" і пазьней у адносінах з тагачаснай ПНР. Былі дзьве пазыцыі – прагматычная і каштоўнасная. Так і цяпер, шэраг краінаў (Нямеччына, Францыя, Італія) – прагматычныя, гатовыя на любы варыянт у адносінах, а іншыя (краіны Цэнтральна-Усходняй Эўропы і Скандынавіі) уважаюць, што без выкананьня рэжымам Лукашэнкі пэўных умоваў усе захады і жэсты застануцца марнымі. З гэтым зьвязана таксама падзеі вакол запрашэньня Лукашэнкі ў Эўропу, на саміт кіраўнікоў краінаў Эўразьвязу і меўшы адбыцца прыезд Лукашэнкі ў Прагу. Адбылося шмат перамоваў і дыскусіяў. Ня можна было дапусьціць яго прыезду ў Прагу, гэта была-б параза для дэмакратыі і наагул для здаровага сэнсу. Мы змагаліся супраць гэтага, нас падтрымалі галяндцы, швэды, фіны, палякі. Спыніліся на варыянце запрашэньня чатырох кандыдатаў-электарантаў, людзей, якія мелі ў Беларусі значную электаральную падтрымку. Варыянт даводзілася на хаду карэктаваць, бо адзін з нас, Мілінкевіч, адмовіўся падпісваць дэклярацыю і выступаў за тое, каб Лукашэнка прыехаў у Прагу. Тады зьмянілі фармат, запрасілі Старшыню Рады БНР І. Сурвілу.

Чэскія ўлады вельмі прыхільна ставяцца да беларускай справы, узднімаюць пытаньні правоў чалавека і зьнішчэньня беларускай мовы як частку зьнішчэньня правоў чалавека для цэлага народу. На сустрэчах чэхі гэта разумелі, падтрымлівалі. Нажаль, з псэўдаапазыцы беларускай ніхто за беларускую мову не выказаўся. А хоць мы былі ў Беларусі палітычнымі праціўнікамі, перад Захадам мы дэманстравалі агульную пазыцыю, нават Казулін паўсюль гаварыў на нядрэннай беларускай мове. Я ўважаю, што як сьцяг падняў, кулаком стукнуў – тады і пацягнуцца людзі. Калі проста прасіць – нічога не будзе. За культуру, калі яна зьнішчаецца, трэба змагацца."

"Цяпер ідзе так званая малочная вайна, абодва бакі кідаюць абвінавачаньні, уводзяцца санкцыі. Фактычна гэта сутыкнуліся не народы, а дзьве карпаратыўныя структуры, якім ходзіць аб падзеле прыбыткаў. Цяпер малаказаводы робяцца карпарацыйным аспэктам у адносінах між дзяржавамі. Вядома, што сельская гаспадарка і ў тым ліку малочная – аснова рэжыму Лукашэнкі. Такім чынам задзейнічаная не прынцыповая пазыцыя, а карпарацыйная палітыка, гандаль прынцыпамі.

Вельмі верагодна, што на восень сацыяльнае становішча абвострыцца, а тут яшчэ і вучэньні "Захад", калі цэлая дывізія, 5000 чалавек, перакідаецца ў Беларусь. Гэта выглядае як расейская акупацыя з мэтай дапамогі рэжыму. Расейскі генэрал Макараў быў выбалтаў пра 2 арміі разам з рыштункам, а гэта ўжо 160 000 чалавек! Ілюзіяў наконт расейцаў няма, яны здольныя на такія справы, як акупацыя. Таму пытаньне пра гэтыя "вучэньні" мусіць паўстаць востра. У гэты пэрыяд падвысяцца пратэстныя настроі людзей. І менавіта стварэньне групаў даверу, якія маглі-б пераняць уладу, будзе надзённай справай. Калі ёсьць актыўныя людзі – значыць, ёсьць эфэктыўныя групы і выніковая дзейнасьць. Цяпержа нават НІСІПІ кажа пра тое, што 86% насельніцтва – супраць злучэньня з Расеяй. Тое адпаведна і з падтрымкай Лукашэнкі ў розных слаях грамадзтва.

Галоўнае пытаньне – каб наступныя выбары адбыліся без Лукашэнкі. Аб гэтым, нажаль, ня ставіцца пытаньне тымі, хто сёньня ўжо стаў заяўляць аб сваіх намерах балятавацца на прэзыдэнта. А Лукашэнка ня мае права ўдзельнічаць у выбарах, і трэба зрабіць усё, каб людзі ведалі гэта, каб не дапусьціць новага тэрміну беззаконьня ў Беларусі."



Затым **архіяпіскап БАП(Н)Ц Юры** запрасіў усіх хвілінай цішы ўшанаваць памяць удзельнікаў Другога Ўсебеларускага Кангрэсу і ўсіх тых, што ляглі ў Курапатах ды лягерох за сваю беларускасьць.

Спн. Валянціна Якімовіч распавяла пра старадаўнюю традыцыю Купальля і заклікала прысутных далучыцца да сьвяткаваньня Купальля ў Нью-Ёрку 20-21 чэрвеня. Старшыня Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы (Моладзь БАЗА) Мікола Цімашэнка распавёў прысутным пра дзейнасьць моладзі, пра дапамогу людзям у Беларусі, заклікаў далучацца.

Адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу.

***Віталь ЗАЙКА***

Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:15 PM Page 9



# Справы, датычныя свабоды рэлігіі ў Беларусі

## *Агляд судовых справаў у акруговых апеляцыйных судох ЗША*

Таталітарную прыроду рэжыму ў Беларусі часта апісваюць як апошнюю дыктатуру ў Эўропе. Згодна з дакладам Дзяржаўнага дэпартамэнту аб свабодзе рэлігіі ў 2007 годзе, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь дэкляруе свабоду веравызнаньня, аднак урад на практыцы абмяжоўвае гэтую свабоду. Гэтае абмежаваньне адбываецца і непасрэдна, і ўскосна. За час, апісаны ў Дакладзе за 2007 год, стан свабоды веравызнаньня ў Беларусі пагоршыўся. Урад працягваў абмяжоўваць свабоду веравызнаньня на падставе артыкулаў моцна крытыкаванага Закону аб рэлігіі ад 2002 году. Улады запалохвалі й штрафавалі сяброў паасобных рэлігійных групаў, асабліва тых, што лічацца ўладамі носьбітамі замежнага культурнага ўплыву або маючымі палітычныя мэты.

Дадзены досьлед пабудаваны на аналізе чатырох справаў у акруговых судох ЗША, дзе апісваецца перасьлед за рэлігію ў Беларусі. Справы тычацца вернікаў мармонскага, грэка-каталіцкага, рыма-каталіцкага і быптысцкага веравызнаньня. Асобы, справы якіх згадваюцца тут, падалі на палітычны прытулак (азыль, asylum) і затрыманьне высылкі (withholding of removal).

Мармонская верніца Марыя Сімончык прызнала ў сваёй пэтыцыі суду другой акругі, што яе былы досьвед па справе ня зводзіцца да перасьледу. Таму суд меў толькі высьветліць, ці падтрымліваюць існуючыя сьведчаньні адносна становішча з рэлігіяй у Беларусі рашэньне іміграцыйнага судзьдзі пра тое, што Сімончык не прывяла абгрунтаваных доказаў боязі перасьледаў у будучыні (у выпадку вяртаньня ў Беларусь). Сімончык засьведчыла, што спосаб, у які людзі трактавалі яе ў мінулым — уключаючы страту сяброў-немармонаў, звальненьне з працы, грубасьць у адносінах да яе — змушаюць яе лічыць, што ў будучыні яна будзе цярпець з-за свайго веравызнаньня. Яна таксама засьведчыла, што паліцыя перарвала сустрэчу сябраў яе кангрэгацыі й на некалькі гадзінаў затрымала вернікаў яе царквы. Яна не заяўляла, што вернікі яе кангрэгацыі мелі нейкія іншыя крыўды або што ім пагражалі нечым іншым. Дадаткова суд знайшоў, што іміграцыйны судзьдзя не памыліўся, выкарыстоўваючы факт, што кангрэгацыя, да якой належала Сімончык, працягвала дзейнічаць, як дадатковае абгрунтаваньне адмовы ейнага сьцьверджаньня пра перасьлед. Суд падтрымаў выснову іміграцыйнага судзьдзі пра тое, што боязь перасьледу не была даказаная, калі не пацьверджалася ніякімі канкрэтнымі пагрозамі супраць Сімончык або такіх самых, як яна, асобаў. Больш таго, суд высьветліў, што сьведчаньні аб становішчы ў краіне, улучна з дакладам Дзяржэпартамэнту, не паказваюць на перасьлед мармонаў у Беларусі. Сьведчаньні паказваюць на тое, што хоць урад перашкаджае практыку рэлігіі для меншасьцёвых веравызнаньняў праз нявыдачу дазволаў на памешканьні або распаўсюд літаратуры, ён тым ня менш не праводзіць перасьледу нетрадыцыйных цэркваў. У той час як зафіксаваныя некаторыя інцыдэнты, калі асобы былі затрыманыя на некалькі гадзінаў, усё-ж у цэлым спосаб запалохваньня не даходзіць да перасьледу. Суд узгадаў другую частую прычыну адмовы заяваў на азыль, менавіта, папярэдняе вяртаньне ў краіну колішняга перасьледу. Вяртаньне Сімончык у Беларусь пасьля ейнага першага прыезду ў ЗША падарвала ейную заяву аб боязі перасьледу. Істотна, што большасьць апісаных фактаў, калі Сімончык была прычыненая крыўда, мелі месца перад першым прыездам у ЗША.

У другой справе грэка-каталіцкі вернік Яўген Паджыленка прадставіў іміграцыйнаму судзьдзі сьцьверджаньне аб мінулым перасьледзе на грунце рэлігіі. Ён засьведчыў, што практыкаваў сваю рэлігію падчас штотыднёвых сходаў і асноўных сьвятаў у дамах сяброў праз супольныя маленьні й набажэнствы. Ён адзначыў, што калі яму было 7 год, ягоныя настаўнікі ў Беларусі дапускалі абразы супраць грэка-каталікоў. Паджыленка таксама сьцьвярджаў, што прыкладна ў той час міліцыя абшукала дом ягонай сям'і і падчас гэтага штурхалі і зьбівалі яго і маці, і што ягоная сям'я ўцякла ў Польшчу, бо яны ўважалі, што яны могуць мець "нармальнага жыцьця ў Беларусі". Пасьля трох год у Польшчы яны вярнуліся ў Беларусь, але ў іхным доме ўжо жылі чужыя людзі. Празь месяц пасьля таго, як нарэшце яны змаглі засяліцца назад у сваю хату, яны былі выселеныя міліцыяй, якая нанесла Паджыленку і ягонай маці такія пашкоджаньні, што абодва мусілі быць шпіталізаваныя. Маці мела зрушэньне мозгу, а сын — пашкоджаньні рук ад зьбіцьця міліцэйскімі дубінкамі. Затым увесь час да ад'езду ў ЗША яны пражылі ў сяброў.

Іміграцыйны судзьдзя палічыў сумнеўным сьведчаньне Паджыленкі пра антыгрэка-каталіцкія выказваньні настаўнікаў пачатковай школы, уважаючы, што цяжка паверыць ня толькі ў тое, што настаўнік пачатковай школы стаў-бы захоўвацца ў гэткі спосаб, але і што Паджыленка зразумеў-бы гэта ў сямігадовым узросьце і змог-бы прыпомніць гэта праз шмат гадоў. Іміграцыйны судзьдзя прызнаў верагоднасьць таемных набажэнстваў у дамах сяброў пры камуністычным рэжыме ў часы СССР, але не было пададзена доказаў таго, што Паджыленка або яго бацькі страчвалі працу або былі зьбітыя дзеля таго, што вызнавалі грэка-каталіцкую рэлігію. Іміграцыйны судзьдзя зрабіў выснову, што сьведчаньне Паджыленкі само па сабе не даказвае перасьледу, і таксама не было ясна, ці міліцыя дзеіла, маючы антырэлігійныя матывы. Іміграцыйны судзьдзя адзначыў, што хоць абставінаў ператрусу хаты Паджыленкаў, іхныя ўцёкі ў Польшчу і высяленьне пасьля вяртаньня ў Беларусь маглі быць вынікам антырэлігійнага перасьледу, але Паджыленка падаў непераканаўчыя дэталі гэтых падзеяў. Іміграцыйны судзьдзя знайшоў, што дакумэнты, пададзеныя ў гэтай справе, ёсьць гэтак-жа няпераканаўчыя і не даказваюць антырэлігійных намераў пры высяленьні з хаты. Іміграцыйны судзьдзя знайшоў, што высяленьне згодна з пададзенымі дакумэнтамі магло адбыцца і на законных падставах, як нявыплата падаткаў і невыкананьне жыльлёвага заканадаўства. У выніку справа Паджыленкі была адхіленая. Пацьвярджаючы выснову іміграцыйнага судзьдзі, Апэляцыйны суд трэцяй акругі зрабіў выснову, што існуюць пераканаўчыя сьведчаньні ў падтрымку апініі іміграцыйнага судзьдзі адносна таго, што Паджыленка не прадставіў належных доказаў перасьледу або боязі перасьледу ў будучым. Ані захаваньне настаўнікаў, ані дзеяньні міліцыі не адпавядаюць вызначэньню "перасьлед за рэлігію" без дакладных доказаў, што матывамі дзеяньняў уладаў супраць сям'і Паджыленкаў была непрыязь да іхнай рэлігіі.



У наступным прыкладзе рыма-каталіцкі вернік Генадзь Міхайлевіч адзначыў у сваёй заяве на азыль:

*"Мой бацька расеец і каталік усходняга абраду, а мая маці беларуска і рыма-каталічка. Дзеля гэтага яны цярпелі перасьлед. Мая маці заўсёды была вельмі рэлігійная, як і яе бацькі і браты. Яны цярпелі перасьлед за тое, што былі рыма-каталікамі. Дзеля сваіх рэлігійных перакананьняў і маёй рэлігійнай дзейнасьці КГБ ў савецкі час, а пасьля КГБ РБ, затрымлівалі, дапытвалі, запужвалі і пагражалі мне."*

Міхайлевіч затым адзначыў, што калі-б ён вярнуўся ў Беларусь, ён "падпаў-бы пад перасьлед, затрыманьні, допыты і пагрозы з боку дзяржаўных структураў і міліцыі. Яны-б пасадзілі мяне ў турму, і маё жыцьцё апынулася-б пад пагрозай". Заяўнік прывёў розныя выпадкі перасьледу, ад якога ён пацярпеў, жывучы ў Беларусі, уключаючы наступнае: 1) КГБ дапытваў яго і пагражаў яму за ягоную рэлігійную дзейнасьць; 2) КГБ правёў ператрус у ягонай хаце і па месцы працы дзеля ягонай рэлігійнай дзейнасьці. Міхайлевіч прызнаў пры гэтым, што ніколі ня быў арыштаваны, кінуты ў турму або фізычна пацярпеў за сваю рэлігійную дзейнасьць.

Аддзел па справах азылю пры Дзяржэпартамэнце падаў такую дарадчую апінію: "За камуністаў усе вернікі ў Беларусі былі перасьледаваныя. Аднак пасьля набыцьця Беларусьсю незалежнасьці ўрад збольшага талерантны да практыкаваньня бальшыні рэлігіяў, у тым ліку да рыма-каталіцтва. Разам з тым ёсьць некаторыя выпадкі перадузятага стаўленьня да рыма-каталіцтва, пераважна таму, што яно лічыцца зьвязаным з Польшчай, гістарычным ворагам Беларусі. У мінулым годзе прэзыдэнт Беларусі паставіў пад сумненьне ляяльнасьць рыма-каталікоў. Дзейнасьць замежных ксяндзоў, большасьць якіх ёсьць грамадзяне Польшчы, сустракае пэўныя перашкоды. Усё гэта не надае пазытыву да клімату рэлігійнай і нацыянальнай талерантнасьці. Разам з гэтым рыма-каталіцкі касьцёл у Беларусі квітнее і разьвіваецца, яму вернуты шэраг будынкаў, сканфіскаваных у часы камунізму. Мы ня маем прыкладаў забароны ці перашкодаў практыкаваць рэлігію шараговым рыма-каталікам. Гэткім чынам, тады як некаторыя дзеяньні ўладаў Беларусі былі скрытыкаваныя, прыкладам, у нашым "Дакладзе ў галіне правоў чалавека па краінах сьвету", гэтыя дзеяньні не ўяўляюць сабой сыстэматычных парушэньняў."

Хаця сьведчаньні Міхайлевіча былі прызнаныя "ў асноўным верагоднымі" і ягоная боязь перасьледу ў Беларусі была "суб'ектыўна шчырай", іміграцыйны судзьдзя пастанавіў, што Міхайлевіч не даказаў, што пацярпеў ад перасьледу ў мінулым ці што ён мае абгрунтаваную боязь перасьледу ў выпадку вяртаньня ў Беларусь. Іміграцыйны судзьдзя адзначыў, што ў справе ёсьць доказы запалохваньня Міхайлевіча, але толькі запалохваньні не ўяўляюць сабою перасьледу. Апэляцыйны суд шостай акругі зрабіў выснову, што доказаў фізычнага ўздзеяньня на Міхайлевіча, нанясеньня пашкоджаньняў, абмежаваньня свабоды дзеля рэлігійных перакананьняў не было ўстаноўлена, і таму адхіліў заяву на азыль. Суд адзначыў цяжкасьць адрозьненьня паміж перасьледам і запалохваньнем у некаторых выпадках.

У апошняй аналізаванай справе вернік-баптыст Віктар Валюкевіч сьцьвярджаў, што баптысцкая вера вымагае ягонага ўдзелу ў місіянэрскай дзейнасьці сярод грамадзтва ў Беларусі, дзе насельніцтва збольшага праваслаўнага або каталіцкага веравызнаньня. У сваёй заяве на азыль ён падкрэсьлівае, што на яго адбываліся напады, і што ён цярпеў абразы ад розных асобаў у выніку ягоных спробаў весьці місіянэрскую дзейнасьць. Ён сьцьвярджаў, што баіцца перасьледу ў Беларусі за сваю рэлігію. Іміграцыйны судзьдзя прызнаў Валюкевіча не прыдатным да азылю, таму што напады, якія быццам былі ўчыненыя на Валюкевіча, не былі вынікам яго рэлігійных перакананьняў, не былі санкцыянаваныя ўрадам або нейкімі арганізаванымі групамі, і не дасягнулі катэгорыі перасьледу. Апеляцыйны суд восьмай акругі зрабіў выснову, што заяўнік не даказаў, што беларускі ўрад перасьледваў яго, не жадаў ці быў ня ў стане кантраляваць варожыя дзеяньні збоку праваслаўнай большасьці. Суд узгадаў даклады Дзяржэпартамэнту, дзе адзначалася тое, што дзяржава падтрымлівала гарантыі рэлігійнай свабоды і што грамадзянам Беларусі не забараняецца місіянэрская дзейнасьць.

Разглядаючы гэтыя чатыры фэдэральныя судовыя справы варта адзначыць, што яны не адлюстроўваюць усе шматлікія пытаньні, зьвязаныя з справамі, пададзенымі ў Аддзелы па азылі, Іміграцыйныя суды і Бюро іміграцыйных апэляцыяў. Шмат з тых справаў вырашаюцца пасьпяхова на карысьць заяўнікаў. Разам з тым яны даюць зрэз фактычных і юрыдычных пытаньняў, зь якімі сутыкаюцца вышэйузгаданыя агенцыі і юрысты. Больш таго, Дзяржэпартамэнт ЗША ды іншыя міжнародныя агенцыі прызнаюць, што ў Беларусі існуюць абмежаваньні на свабоду рэлігіі.

Як абмяркоўвалася вышэй, вынік многіх справаў залежаў ад таго, ці кваліфікаваліся прыведзеныя факты як перасьлед, ці як запалохваньне. Аднак Апэляцыйны суд шостай акругі ў справе Качая зазначыў, што "мяжу паміж перасьледам і запалохваньнем усталяваць надзвычай цяжка". У краінах, да якіх належыць Беларусь, што абмяжоўваюць свабоду рэлігіі, гэтая мяжа нават яшчэ менш заўважная.

***Алекс БЭРД,***
***Патрык КЛАЎС***
***Email: aberd@berdklauss.com***

**Alex Berd** and Patrick **Klauss** are partners **at Berd & Klauss, PLLC** in NYC (**www.berdklauss.com**).

The firm represents corporations and individuals in a variety of areas such as business and employment immigration, family immigration, consular matters, naturalization, deportation defense and asylum.

Bielarus558c.qxd 6/28/2009 9:16 PM Page 2



# Шахматы для ўсіх

З 7 па 17 траўня ў Сэнт-Люісе, штат Мізуры, прайшоў чэмпіянат ЗША па шахматах. У спаборніцтве ўзялі ўдзел 24 мацнейшых шахматысты, 12 зь якіх – выхадцы з былога СССР. Наш зямляк, міжнародны гросмайстар Юры Шульман абараняў свой тытул чэмпіёна Злучаных Штатаў, які ён заваяваў летась ў Аклагоме. Да шостага туру Юры заставаўся сярод лідэраў, але прыканцы прайграў некалькі матчаў і апынуўся толькі на шостым месцы. Тытул чэмпіёна адыйшоў да маладога гросмайстра Гікару Накамуры зь Нью-Ёрку. Тым не менш, Юры кваліфікаваўся ў Кубак сьвету, дзе яму давядзецца змагацца з мацнейшымі шахматыстамі плянэты.



*Чэмпіён ЗША 2009 г. былы мянчук Юры Шульман*

Юры Шульман нарадзіўся ў Менску ў 1975 годзе, а ўжо ў 1995 годзе заваяваў тытул міжнароднага гросмайстра і чэмпіёна Эўропы. Чатыры гады пасля таго, Юры пераехаў у ЗША і адразу зарэкамендаваў сябе як аднаго з мацнейшых гульцоў. Леташні год быў самым пасьпяховым для Юры, калі ён перамог на чэмпіянаце ЗША, а таксама заняў трэйцяе месца на Сусьветнай шахматнай алімпіядзе ў Дрэздэне. Але на гэтым наш зямляк не спыняецца, і імкнецца заваяваць самы высокі шахматны тытул – чампіёна сьвету, чаго я яму ад шчырай душы жадаю!

Рашэнне задачкі, пададзенай ў мінулым нумары:
1.Фf6 Kc7
2.Фe7 мат, ці
1.Фf6 Ke8
2.Cc6 мат.

Нягледзячы на тое, што правільных адказаў у нас не было, і фактычна пераможцы няма, вельмі хачу падзякаваць усіх за ўдзел у конкурсе, і асабіста Кацярыне Мазурэнка, якая першай даслала свой адказ. Ёй мы і прызначаем першы прыз *літаратурны альманах "Беларус"*. Нашы віншаваньні, Кацярына!

А для усіх аматараў шахмат, хто хочуць паспрабаваць сваё сілы, прапаную наступную задачку: ход белых, мат у два ходы. Дасылайце свае адказы на мой электронны адрас у інтэрнэце: *palina_churun@yahoo.com*. Аўтар першага правільнага адказу атрымае прыз ад рэдакцыі газэты (*CD гурта "NRM"*).

Жадаю посьпехаў.

***Паліна ЧУРУН***



## Марш Паняволеных Народаў

**У нядзелю, 19 ліпеня, у Нью-Ёрку пройдзе Марш Паняволеных Народаў, першая падзея Тыдня Паняволеных Народаў, у якім традыцыйна бярэ удзел беларуская грамада Амэрыкі.**

- **9:00** - **раніцы збор удзельнікаў на 5-й Авэню і 59-й вуліцы (ля фантану гатэля Plaza).**
- **10:00** - **імша за Паняволеныя Народы ў Катэдры сьвятога Патрыка.**
- **11:00** - **марш па 5-й Авэню да 72-й вуліцы.**
- **12:00** - **афіцыйнае адкрыцьцё Тыдня Паняволеных Народаў (Цэнтральны парк).**

У чацьвер, 23 ліпеня, а 11:00 пройдзе дэманстрацыя перад будынкам Аб'еднаных Нацыяў, а ў нядзелю 26 ліпеня - урачыстае набажэнства ў лютаранскай царкве на 122 E. 88-й вул. (пры Лексінгтан Авэню) і цырымонія закрыцьця.

Арганізаваны Камітэтам Паняволеных Народаў, які паўстаў у 1950-я гады, Тыдзень Паняволеных Народаў, часткаю якога ёсьць гэты Марш, быў масавай імпрэзай эміграцкіх арганізацыяў з краінаў, якія калісьці зьняволіў савецкі камунізм, у тым ліку Беларусі. Сёньня большасьць тых краінаў вызвалілася і здабыла свабоду.

Беларусь засталася паняволенай прамаскоўскім дыктатарскім рэжымам, там зьліквідаваная дэмакратыя, парушаюцца правы чалавека, зьнішчаецца нацыянальная культура. Таму беларуская грамада працягвае браць удзел у імпрэзах Тыдня Паняволеных Народаў, выказваючы свой пратэст.

Беларуская праваслаўная царква сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт-Рывэры, Нью-Джэрзі, ветліва запрашае Вас, Вашую сям'ю і Вашых знаёмых на сьвяткаваньне беларускіх традыцыяў.

**Сёлета парафіяльны камітэт ладзіць 10-ы**

## Беларускі Фэстываль - 2009

у царкоўным парку і залі ў суботу **18-га ліпеня 2009 году**
**Пачатак а 11-й гадзіне раніцы, заканчэньне а 8-й вечара.**

Прыходзьце на смачныя стравы. Будуць гучэць беларускія фальклёрныя мэлёдыі і прадавацца сувэніры. Фэстываль адбудзецца ня гледзячы на надвор'е - "Ці сонца, ці дождж!"

**3 пытаньнямі звaніце ў Беларускі Грамадзкі Цэнтар (732) 613-7171.**

**Віншуем шаноўнага сп. Антона ШУКЕЛОЙЦЯ з днём народзінаў! Жадаем яму здароўя, бадзёрасьці, аптымізму, даўгалецьця - каб пабачыў сапраўды вольную і незалежную Бацькаўшчыну-Беларусь.**

Мы ведаем сп. Шукелойця як адданага і ахвярнага грамадзкага дзеяча, чалавека, які зьвязаў усё сваё жыцьцё, ад даваеннага часу, калі быў у Партыі беларускіх эсэраў і ў Беларускім Студэнцкім Саюзе ў Вільні, зь беларускай справай. Потым быў арышт НКВД, вайна, праца ў Беларускім музэі ў Менску ў складаных і трагічных умовах ваеннага ліхалецьця і акупацыі. Беларуская справа працягвалася ў імкненьні наватy тых немагчымых умовах працаваць для Бацькаўшчыны. Як сябар Беларускай Незалежніцкай Партыі сп. Шукелойць з групай іншых патрыётаў змагаўся супраць абодвух таталітарных рэжымаў, якія тады вырашалі лёс беларусаў. Потым была эміграцыя, новы этап грамадзкай дзейнасьці, плён якой мы адчуваем да сёньня.

Дзякуем Вам, сп. Шукелойць, за вернасьць абранаму ў маладосьці шляху, за волю і веру ў перамогу справядлівай справы - свабоды, нацыянальнай культуры і дэмакратыі для Бацькаўшчыны.

***Управа і сябры Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА***

## Прыватныя абвесткі

Віншуем **Лявона Юрэвіча** з днём нараджэньня. Зычым плёну ў працы і шчасьця ў асабістым жыцьці.

**Сябры**

---

**Пятро Грыгальчык** з Флёрыды з самымі найлепшымі пажаданьнямі віншуе свайго сына **Давіда** з днём нараджэньня.

---

Здаецца **ў рэнт кватэра-студыя** на Статэн-Айлэндзе. аплата $750 на месяц, уключаючы газ і электрычнасьць. Зацікаўленыя тэлефануйце, калі ласка, на **№ 917-754-5058.**

*21 чэрвеня 2009 г. адбыўся гадавы справаздачна-выбарчы сход Фундацыі імя П. Крэчэўскага. У наступным нумары будзе пададзена справаздача сходу і паведамленьне пра мінулую і будучую дзейнасьць.*

***Адміністрацыя***

***Газэта "БЕЛАРУС"***
***бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й аб'явы некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш. Накoнт разьмяшчэньня рэклямы кантактуйце рэдакцыю.***

## *НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА" АХВЯРАВАЛІ:*

| | |
|---|---|
| **А. Кіпель** | **240** |
| **М. Дэмковіч** | **100** |
| **В. Рамук** | **65** |
| **М. Давідзюк** | **50** |
| **Я. Запруднік** | **50** |
| **Т. Красоўская** | **50** |
| **У. Піерс-Адашкевіч.** | **50** |
| **С. Будкевіч** | **40** |

**Замест кветак на магілу Аліны ЛОСІК-ЛЫСЮК:**

| | |
|---|---|
| **Л. Бакуновіч** | **50** |

**Усім шчыры дзякуй!**

**БЕЛАРУС**
*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*
**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва: *baza-belarus.org***
**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

**BIELARUS**
*Belarusan Newspaper in the Free World*
Published monthly by
***Belarusan American Ass'n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***

**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць пагляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**
**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**
© BIELARUS, 2009
**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***
ISSN 1054-9455
**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэкламадаўца.**